НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
БЕЛОРУССКАЯ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННАЯ БИБЛИОТЕКА
ИМ. И.С. ЛУПИНОВИЧА
ИНСТИТУТ ИСТОРИИ

СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ СКВОЗЬ ПРИЗМУ НАУЧНЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

ДОКЛАДЫ
III МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
Минск, 26 сентября 2025 г.



НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ

Белорусская сельскохозяйственная библиотека
им. И.С. Лупиновича

Институт истории

СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ СКВОЗЬ ПРИЗМУ НАУЧНЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ

Доклады III Международной научной конференции, приуроченной к 80-летию Победы в Великой Отечественной войне, Минск, 26 сентября 2025 г.

Минск
«СтройМедиаПроект»
2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 63(091)(476)
ББК 4г
С29

Редакционная коллегия:
Ю. О. Каракулько (отв. ред.),
В. Б. Бабарико-Омельченко, В. Н. Жук, В. Г. Мазец, О. А. Морозова,
В. В. Слемнева, Н. С. Шакура

Рецензенты:
кандидат исторических наук С. А. Третьяк
кандидат исторических наук, доцент Е. А. Гребень

С29 **Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований** : доклады III Международной научной конференции, приуроченной к 80-летию Победы в Великой Отечественной войне, Минск, 26 сентября 2025 г. / Национальная академия наук Беларуси, Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И. С. Лупиновича, Институт истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск : СтройМедиаПроект, 2025. – 296 с.

ISBN 978-985-7296-75-0

В сборник включены доклады участников III Международной научной конференции, приуроченной к 80-летию Победы в Великой Отечественной войне, «Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований».

Опубликованы доклады представителей различных отраслей науки – исторических, сельскохозяйственных, педагогических, архитектуры: ученых академических научных учреждений, преподавателей учреждений образования, руководителей и специалистов библиотек и музеев Беларуси и России.

Материалы сборника могут представлять интерес для историков, специалистов, работающих в сфере науки, образования, сельского хозяйства, информационной и библиотечной отрасли, ученых и исследователей, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов, а также всех, кто интересуется вопросами истории.

Авторы опубликованных статей несут персональную ответственность за точность и достоверность представленной информации.

УДК 63(091)(476)
ББК 4г

ISBN 978-985-7296-75-0

©ГУ «Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича» Национальной академии наук Беларуси, 2025

©Оформление. ГП «СтройМедиаПроект», 2025

1В499896
ЦНБ им. Я. Коласа
НАН Беларуси

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library

Institute of History

AGRICULTURE OF BELARUS THROUGH THE PRISM OF SCIENTIFIC RESEARCH

Proceedings of the International scientific conference, dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War
Minsk, September 26, 2025

Minsk
"StroyMediaProekt"
2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси – http://library.basnet.by

UDC 63(091)(476)

Editorial board:
Yu. A. Karakulka (managing editor),
V. B. Babaryka-Amelchanka, V. M. Zhuk, V. G. Mazets, O. A. Morozova,
V. V. Slyamnyova, N. S. Shakura

Reviewers:
PhD in Historical sciences S. A. Tretyak
PhD in Historical sciences, associate professor E. A. Greben

Agriculture of Belarus through the prism of scientific research:. proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025 – Minsk : The State Enterprise "StroyMediaProekt", 2025. 296 p.

ISBN 978-985-7296-75-0

The proceedings include papers presented at the III International scientific conference "Agriculture of Belarus through the prism of scientific research", dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War.

Researchers of different branches of science (historical, agricultural, pedagogical and architectural) have submitted their papers: scientists of academic scientific institutions, students, lecturers of educational institutions, managers and specialists of libraries and museums of Belarus and Russia.

The papers in the proceedings may be of interest to historians, specialists working in science, education, agriculture, information and library sector, scientists and researchers, PhD and Master's degree students, students, as well as to all interested in history.

The accuracy and reliability of the information presented in the papers belong solely to the authors.

UDC 63(091)(476)

ISBN 978-985-7296-75-0

© I.S. Lupinovich Belarusian Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, 2025

©Design. The State Enterprise "StroyMediaProekt", 2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

СОДЕРЖАНИИЕ

РЕШЕНИЕ АГРАРНОГО ВОПРОСА И ВНЕДРЕНИЕ ДОСТИЖЕНИЙ АГРАРНОЙ НАУКИ В СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ

Ерашэвіч А.У. Аб вывазе льну з беларускіх губерняў Расійскай імперыі (10-я – 50-я гг. XIX ст.)..... 10

Макарчык А.А. Штогадовы перадзел сялянскіх сенакосных угоддзяў на Беларусі ў XIX–XX стст..... 19

Мяльчэня С.В. Праект Праваслаўнай царквы па развіццю пчалярства пад час Першай сусветнай вайны і спробы яго рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі (па матэрыялах мясцовых епархіяльных ведамасцей)..... 27

Мікула Я.І. Млыновая справа і выканкамы ў сярэдзіне і 2-ой палове 20-х гг. XX ст. у БССР..... 36

Гарматны В.П. Сялянскае прадпрымальніцтва ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг..... 48

Гарматны В.П. Да пытання правядзення камасацыі ў гміне Цырын Навагрудскага павета і ваяводства ў 1921–1939 гг..... 58

Сергачев С.А. Восстановление сельского хозяйства БССР в конце 1940-х – начале 1950-х гг.: помощь архитектурной науки..... 67

Саракавік І.А. Спроба аграрных пераўтварэнняў у гады перабудовы..... 81

РОЛЬ НАУКИ, ОБРАЗОВАНИЯ И ПРОСВЕЩЕНИЯ В РАЗВИТИИ АГРАРНОЙ ОТРАСЛИ БЕЛАРУСИ

Шимукович С.Ф. «Письма из деревни» А. Н. Энгельгардта о состоянии сельской экономики восточных белорусских земель в последнюю треть XIX века..... 90

Богданова И.Ф. Цветы победы..... 105

Дубовик А.К., Дубовик Е.А. Из истории изобретательства и рационализации в сельском хозяйстве БССР..... 131

Жук В.Н. «Пора по-настоящему связать сельскохозяйственную науку с производством»: как принималось решение о ликвидации республиканских АСХН (1961 г.)..... 143

Смехович Н.В. Аграрная наука и сельскохозяйственное производство в Советской Беларуси (1981–1985 гг.)..... 171

Карбалевіч Н.М. Метадалагічныя асаблівасці класіфікацыі традыцыйных промыслаў і рамёстваў беларусаў у кантэксце вывучэння гісторыі аграрных ведаў..... 180

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси – http://library.basnet.by

Радченко С.А. Способ быстро решать проблемы подготовки кадров для АПК, используя лучший мировой опыт, международное сотрудничество и уникальные хоздоговоры кафедр..... 191

РАЗВИТИЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОЙ НАУКИ БЕЛАРУСИ В БИОГРАФИЯХ

Берёзкина Н.Ю. Вклад профессоров и выпускников Горы-Горецкого земледельческого института в распространение сельскохозяйственных знаний..... 201

Берёзкина Н.Ю. Научная и публикационная деятельность преподавателя Горецкого земледельческого училища М. В. Рытова..... 210

Барапоўскі А.В. Д. Ф. Прышчэпаў: новыя факты да біяграфіі наркама земляробства БССР..... 218

Богданова Н.Ф. Селекционеры – участники Великой Отечественной войны и современные селекционеры в области декоративного садоводства, авторы сортов растений, посвященных Великой Отечественной войне..... 223

Дубовик А.К. Вклад ученых и выпускников БПИ–БГПА–БНТУ в развитие технической базы сельского хозяйства Беларуси..... 236

Морозов В.Н. Формирование агроэкономических академических научных школ БССР в середине XX века: вклад Ф. С. Мартинкевича и И. М. Качуро..... 247

АГРАРНАЯ НАУКА В КОНТЕКСТЕ БИБЛИОТЕЧНО-ИНФОРМАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Пирогова О.В., Гончарова И.В. Место сельскохозяйственной литературы в библиотечных фондах Беларуси XIX – начала XX в.: на примере печатных каталогов..... 255

Важник М.Н., Чегодаева Т.Г. Коллекция «Белорусские аграрные издания начала XX века» в фонде Белорусской сельскохозяйственной библиотеки..... 265

Струц Н.В. Бібліяграфічныя выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пасляваеннага перыяду як сродак папулярызацыі сельскагаспадарчых ведаў..... 277

Слемнёва В.В., Муравицкая Р.А., Шакура Н.С., Аксюто Е.В. Источники, используемые в белорусских диссертационных исследованиях аграрной тематики: анализ библиографии..... 283

Сведения об авторах..... 291

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

CONTENTS

THE SOLUTION TO THE AGRARIAN QUESTION AND INTRODUCTION OF AGRICULTURAL RESEARCH ACHIEVEMENTS INTO THE AGRICULTURE OF BELARUS

Yerashevich A.V. On the export of flax from the Belarusian provinces of the Russian Empire (10th-50th years of the 19th century)..... 10

Makarchyk A.A. Annual redistribution of peasant hayfields in Belarus in the XIX-XX centuries..... 19

Mianchenya S.V. The project of the Orthodox Church to develop beekeeping during the First World War and attempts to implement it on the territory of Belarus (based on the materials of local diocesan bulletins)..... 27

Mikula E.I. Milling business and executive committees in them middle and second half of the 1920s in the BSSR..... 36

Harmatny V.P. Peasant Entrepreneurship in Western Belarus in 1921–1939..... 48

Harmatny V.P. On the issue of conducting land comasation in the gmina of Cyryn of the Novogrudok powiat and voivodeship in 1921–1939..... 58

Sergachev S.A. Restoration of agriculture in the BSSR in the late 1940s – early 1950s: assistance from architectural science..... 67

Sorokovik I.A. An attempt at agrarian reforms during the years of perestroika..... 81

THE ROLE OF SCIENCE, EDUCATION AND ENLIGHTENMENT IN THE DEVELOPMENT OF THE AGRICULTURAL SECTOR IN BELARUS

Shymukovich S.F. «Letters from the Village» by A. N. Engelhardt on the state of the rural economy of the eastern Belarusian lands in the last third of the 19th century..... 90

Bogdanova I.F. Flowers of Victory..... 105

Dubovik A.K., Dubovik A.A. From the history of invention and rationalization in the agriculture of the BSSR..... 131

Zhuk V.M. "It is time to make a real link between agricultural science and production": how the decision to liquidate the republican Academies of Agricultural Sciences was made (1961)..... 143

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Smekhovich N.V. Agricultural science and agricultural production in Soviet Belarus (1981–1985)..... 171

Karbalevich N.M. Methodological features of classification of traditional trades and crafts of Belarusians in the context of studying the history of agrarian knowledge..... 180

Radchenko S.A. A way to quickly solve the problems of training personnel for the agro-industrial complex, using the best world experience, international cooperation, and unique business contracts for departments..... 191

DEVELOPMENT OF AGRICULTURAL SCIENCE IN BELARUS IN BIOGRAPHIES

Beryozkina N.Yu. Contribution of professors and graduates of the Gory-Goretsky agricultural institute to the dissemination of agricultural knowledge..... 201

Beryozkina N.Yu. Scientific and publication activities of M. V. Rytov, a teacher of the Goretsky Agricultural School..... 210

Baranouski A.V. D. F. Pryshchepaw: new facts about the biography of the people's commissar of agriculture of the BSSR..... 218

Bogdanova N.F. Plant breeders who participated in the Great Patriotic War and modern breeders in the field of ornamental horticulture, authors of plant varieties dedicated to the Great Patriotic War..... 223

Dubovik A.K. Contribution of BPI–BSPA–BNTU scientists and graduates to the development of technical base of agriculture in Belarus..... 236

Marozau V.N. Formation of agro-economic academic scientific schools of the BSSR in the mid-twentieth century: the contribution of F. S. Martinkevich and I. M. Kachuro..... 247

AGRARIAN SCIENCE IN THE CONTEXT OF LIBRARY AND INFORMATION ACTIVITIES

Pirogova O.V., Goncharova I.V. The Place of Agricultural Literature in Library Collections of Belarus in the 19th – Early 20th Century: Based on Printed Catalogues..... 255

Vazhnik M.M., Chahadayeva T.G. The collection "Belarusian Agricultural Publications of the Beginning of the 20th Century" in the holdings of the Belarusian Agricultural Library..... 265

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Struts N.V. Bibliographic publications of the National Library of Belarus of the post-war period as a means of popularization of agricultural knowledge..... 277

Slyamnyova V.V., Muravitskaya R.A., Shakura N.S., Aksiuta E.V. Sources used in Belarusian dissertation research on agrarian topics: analysis of the bibliography..... 283

Information about the authors..... 293

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

РЕШЕНИЕ АГРАРНОГО ВОПРОСА И ВНЕДРЕНИЕ ДОСТИЖЕНИЙ АГРАРНОЙ НАУКИ В СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО БЕЛАРУСИ

THE SOLUTION TO THE AGRARIAN QUESTION AND INTRODUCTION OF AGRICULTURAL RESEARCH ACHIEVEMENTS INTO THE AGRICULTURE OF BELARUS

УДК 94:339.166.8:633.521(476)(091)“18”
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097893

А. У. Ерашэвіч

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

АБ ВЫВАЗЕ ЛЬНУ З БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (10-Я – 50-Я ГГ. XIX СТ.)

Анатацыя. У артыкуле раскрываецца роля пэўных беларускіх губерняў у вывазным гандлі льнянымі таварамі ў 1810-я – 1850-я гг. Прылеглыя да воднага басейну Заходняй Дзвіны шэраг паветаў Віцебскай і Віленскай губерняў займаліся развядзеннем льну і яго экспартам у Рыжскі порт. Асаблівае значэнне для памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарак мела рэалізацыя льну і льнянога семя ў Віцебскай губерні. Знешні гандаль льном і семем служыў гэтым саслоўям істотным сродкам для падтрымкі матэрыяльнага стану і атрымання грошай з мэтай выплаты дзяржаўных падаткаў.

Ключавыя словы: лён, вывазны гандаль, беларускія губерні, даходы.

Для цытавання. Ерашэвіч, А. У. Аб вывазе льну з беларускіх губерняў Расійскай імперыі (10-я – 50-я гг. XIX ст.) / А. У. Ерашэвіч // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 10–18.

А. В. Ерошевич

Белорусский государственный экономический университет, Минск, Беларусь

О ВЫВОЗЕ ЛЬНА ИЗ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (10-Е–50-Е ГГ. XIX В.)

Аннотация. В статье раскрывается роль определённых белорусских губерний в вывозной торговле льняными товарами в 1810-х – 1850-х гг. Прилегающие к водному бассейну Западной Двины ряд уездов Витебской и Виленской губерний занимались разведением льна и его экспортом в Рижский порт. Особенное значение для помещичьих и крестьянских хозяйств имела реализация льна и льняного семени в Витебской губернии. Внешняя торговля льном и семенем служила этим сословиям существенным средством для поддержки материального состояния и получения денег с целью выплаты государственных налогов.

Ключевые слова: лён, вывозная торговля, белорусские губернии, доходы.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Aliaksandr V. Yerashevich

Belarusian State Economic University, Minsk, Belarus

ON THE EXPORT OF FLAX FROM THE BELARUSIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE (10TH-50TH YEARS OF THE 19TH CENTURY)

Abstract. The article reveals the role of certain Belarusian provinces in the export trade of linen goods in the 1810s – 1850s. A number of counties of Vitebsk and Vilna provinces adjacent to the Western Dvina water basin were engaged in flax cultivation and its export to the port of Riga. The sale of flax and flaxseed in Vitebsk province was of particular importance for landowners and peasants. The foreign trade in flax and seed served these estates as an essential means of supporting their material condition and obtaining money to pay state taxes.

Keywords: flax, export trade, Belarusian provinces, revenues.

For citation. Yerashevich A. V. On the export of flax from the Belarusian provinces of the Russian Empire (10th-50th years of the 19th century). Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 11–18 (in Belarusian).

Вырошчванне льну ў якасці прадзільнай і алейнай раслiннай культуры на тэрыторыі Беларусі вядома здаўна. Льняное валакно было асноўнай сыравінай для вырабу ільняных тканін, нітак, адзення, вяровак і інш. З льнянога семя атрымлівалі ільняны алей. Ільняную макуху маглі выкарыстоўваць на корм жывёле. Лён быў значным экспартным таварам. Праўда пасевы льну выклікалі паслядоўнае высільванне глебы. Да сярэдзіны XIX ст. якасць льну не патрабавала празмернай ачысткі яго валакна.

Асаблівае значэнне ігралі пасевы льну ў маладаходнай па ўзроўні з іншымі беларускімі Віцебскай губерні. Тут рэалізацыя таварнага льну ператварылася для многіх памешчыкаў ў неабходнасць для спраўнай выплаты дзяржаўных падаткаў. Землеўладальнікі сталі патрабаваць ад сялян не выплат аброкаў грашыма, а ўзносам замест іх пэўнай колькасці тавараната льну натурай. Толькі заможныя гаспадары, якія мелі ад 50 да 100 руб. сер. запасу, не сеялі льну [1, с. 220, 221].

У маёнтках непадалёк ад Заходняй Дзвіны памешчыкі Віцебскай губерні мелі значныя даходы ад льну і льновырабаў, якія складалі ад 20 да 50 % усіх грашовых паступленняў ад продажу сельскагаспадарчых прадуктаў [2, с. 392]. Інвентар маёнтка Марцінкова Віцебскага павета сведчыў, што для памешчыкаў галоўным спосабам выручкі грошай для выплаты дзяржаўных падаткаў і задавальнення дамашніх выдаткаў быў продаж таварнага

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

льну. Іншыя вырабы і заняткі былі абмежаванымі і нязначнымі па долі грашовых даходаў [3, с. 373].

Міністэрства дзяржмаёмасцей 31.12.1843 г. выдала цыркуляр аб развядзенні льну. Палатам дзяржаўных маёмасцей было дадзена асобнае настаўленне. У мэтах заахвочвання льнаводства сярод сялян указам Сената ад 4.05.1853 г. ім было дазволена гандляваць ім без асаблівых дазволаў і пасведчанняў.

Большую частку таварнага льну ў Віцебскай губерні давалі скарбовыя сяляне Полацкага, Лепельскага, Дрысенскага, Себежскага і іншых прылеглых да порта інфлянцкіх паветаў. Санная дарога зімой у Рыгу была для сялян галоўнай крыніцай аплаты дзяржаўных падаткаў і падтрымкі дабрабыту. Найбольш займаліся гандлем ільну і пянькі ў Полацкім павеце [4, с. 257, 260]. У Рыгу лён звозіўся для яго наступнага продажу і пакупкі ў горадзе солі. Селянін ў пачатку 1850-х гг. за прывезеныя 5–6 пудоў льну ў Рыгу закупляў там 8 пудоў солі і меў 4 цалковых (сярэбраных рублёў – А. Е.) [1, с. 221, 222]. Пераапрацаваны лён куплялі за грошы ў выглядзе галандскага палатна [5, с. 51]. У 1848 г. дзяржаўныя сяляне Віленскай губерні сабралі 95 770 пудоў льну (каля 45 % збору губерні) [6, л. 60], але ў 1849 г. толькі 36 098 пудоў, а ў 1850 г. 6 974 пуда.

З паўчвэрці засеянага льнянога семя ў Віцебскай губерні атрымлівалі не больш 6 пудоў звычайнага ўраджаю льну, кошт якога ў месцы збору ў пачатку 1850-х гг. даходзіў да сумы не больш 10 руб. сер. за беркавец (у Віцебскай губерні беркавец вылічаўся ў 12,5 пудоў, але ў Віленскай губерні вагаўся паміж 10–12 пудамі – А. Е.) [1, с. 219]. У Ковенскай губерні чысты прыбытак ад льну у 1850-х гг. складаў больш 45 руб. за беркавец [7, с. 383].

Зразумела, што ў Віцебскай губерні ўраджаі льну і цэны на яго не былі пастаяннымі і вагаліся ў залежнасці ад частых няўродаў хлеба, спрыяльнай знешнеэканамічнай кан'юнктуры, кошту транспарціроўкі, іншых абставін. Пасля вайны 1812 г. па Віцебскай губерні адзначалася скарачэнне замежнага попыту, паступовы заняпад рыначных цэн на тавары, скарачэнне воптавага гандлю, абароту капіталаў і крэдыту. Калі за лён да 1822 г. давалі 50–60 руб. сер. за беркавец, то ў 1827 г. толькі 20–26 руб. сер. за беркавец [8, арк. 88, 88 адв.]. У 1848 г. у Віцебскай губерні было выраблена 357 810 пудоў ці прыкладна 28 624,8 беркаўцаў льну коштам у

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

715 620 руб. сер. [9, с. 175, 176]. Але ўжо ў 1850 г. у Віцебскай губерні сабралі 23 442 беркаўцаў льну, у тым ліку ў 6 беларускіх паветах да 10 707,12 беркаўцаў (45,67 %). У 1850 ці 1851 г. кошт льну ацэньваўся ў 589 860 руб. сер. [10, арк. 4 адв.]. Прадажны кошт таварнага льну ў Полацкім павеце ў гэтым годзе быў ад 1,1 да 1,25 руб. за пуд, у Суражскім – ад 1 да 3 руб. за пуд (семя каштавала 4 руб.), у Гарадоцкім – ад 22 да 26 руб. за беркавец, у Дрысенскім – ад 24 да 28 руб. за беркавец, у Віцебскім – ад 24 да 30 руб. за беркавец, у Лепельскім – 33 руб. за беркавец. Адным словам, кошт таварнага льну залежыў ад блізасці сплаўных водных шляхоў зносін [11, арк. 4–5, 23–24, 28–29, 36–37, 40–41, 50–51]. Да прыкладу, сярэдні кошт ад збору льну ў Віцебскай губерні ў 1850 г. складаў 25,11 руб. за беркавец (каноплей толькі 6 руб. за беркавец). За чвэрць цукровых буракоў давалі 1,891 руб., а яблынь і груш – 4,18 руб. [11, арк. 55–56]. Транспарціроўка льну і льнянога семя да прыстаняў часам складала амаль 1/3 кошту груза [12, с. 134].

У 1840-х – 1850-х гг. у Віцебскай губерні вырабляліся для продажу льну-валакна на суму ад 600 тыс. да 1 млн. руб., акрамя семені і масла. Паводле справаздач губернатараў за 1846 і 1848 гг. лён выступаў галоўным прадметам знешняга гандлю Віцебскай губерні [13, л. 44–45; 14, л. 44; 15, с. 175]. Аднак да 1850-х гг. цэны на лён і пяньку на замежных рынках упалі ў сувязі з канкурэнцыяй таннага індыйскага канатніка і замяшчэннем баваўляльна-папяровых тканін палатнянымі [16, с. 132]. Калі ў 1841 г. у Рыгу з Віцебскай губерні было вывезена льну на 300 тыс. руб. (100–120 тыс. пудоў) (па іншых даных 226 290 пудоў льну коштам у 1,75 руб. за пуд) [17, арк.122], то ў 1856 г. 80 тыс. пудоў [18, л. 29 об.; 19, л. 14].

Тым не менш, афіцыйныя звесткі губернатарскіх справаздач не зусім дакладныя (у іх не заўсёды фіксаваўся экспарт льнянога семя) і патрабуюць удакладненняў. Так, даныя грузапатокаў з Віцебскай прыстані сведчаць, што ў 1811 г. з яе было адпраўлена 3 тыс. пудоў льнянога семя, у 1812 г. – 1 190 пудоў льнянога семя і 1 110 беркаўцаў (13 875 пудоў) льну, у 1813 г. – 3 563 пудоў льнянога семя і 734 беркаўцаў (9 175 пудоў) льну, у 1814 г. – 3 930 пудоў льнянога семя і 1 290 беркаўцаў (16 125 пудоў) льну, у 1859 г. – 93 тыс. пудоў льнянога семя і 81 тыс. пудоў льну і кудзелю («кудзель», «кудзеля» – ачышчанае вычасанае ад костры валакно льну, прыгатаванае для

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

прадзення – А. Е.), у 1860 – 124 тыс. пудоў льнянога семя і 108 тыс. пудоў льну і кудзелю [20, с. 288–289; 21, с. 422, 426–427; 22, прилож., с. 4–5]. Адным словам, з 1814 па 1860 гг. вываз льнянога семя з прыстані губернскага цэнтра Віцебскай губерні павялічыўся ў 31,5 раз, а льну і кудзелю амаль у 6,7 раза.

Пяньку і лён таксама экспартавалі да Рыгі і з паветаў Магілёўскай губерні, у асноўным з Магілёўскага, Быхаўскага, Рагачоўскага, Чэрыкаўскага [23, арк. 16–16 адв.].

Меншае значэнне меў збыт льну ў Гродзенскай губерні. Паводле звестак гарадской і земскай паліцыі у 1815 г. з паветаў і гарадоў Гродзенскай губерні за граніцу было вывезена толькі 6 004 пудоў льну [24, арк. 89].

Акрамя Віцебскай другім значным цэнтрам развядзення і гандлю льном была Віленская губерня. Праўда, ён вывозіўся ў асноўным з Вілейскага, Ашмянскага і асабліва Дзісенскага паветаў і ў нязначных памерах з Лідскага і Свянцянскага [25, с. 470; 26, л. 15]. У 1854 г. у адным Дзісенскім павеце ў памешчыцкіх маёнтках штогод збывалі да 74 тыс. пудоў льняных вырабаў у Рыгу. У астатніх Віленскім і Трокскім паветах Віленскай губерні лён выкарыстоўваўся толькі на мясцовыя патрэбы [27, l. 19–19v.]. У 1849 г. у Віленскай губерні было сабрана у памешчыцкіх маёнтках 109 602 пуда (8 768,16 беркаўцаў), а на палях дзяржаўных сялян 36 098 пудоў (2 887,84 беркаўцаў), разам 11 656 беркаўцаў льну [28, л. 116]. Па даных за 1857 г. у 5 беларускіх паветах Віленскай губерні сабралі 124 500 пудоў ці 9 960 беркаўцаў льну, у тым ліку найбольш усяго ў Дзісенскім (71 тыс. пудоў ці 5 680 беркаўцаў, альбо 57,03 %) [29, l. 4–5, 7–8, 10–11, 13–14, 19–20, 22–23, 25–26, 30].

Яшчэ адным рэгіёнам збыту льну была Ковенская губерня. У 1843–1847 гг. лён даваў каля 10 % сумы яе экспарту. У 1858 г. з Ковенскай губерні ў Рыгу было накіравана 648 026 пудоў (64 802 беркаўца) льну, у тым ліку 160 тыс. пудоў (24,69 %) з Новааляксандраўскага павета [30, с. 339]. Распаўсюджаны ў Новааляксандраўскім павеце асабліва каштоўны так званы ракішскі (па маёнтку Ракішкі Р. Тызенгауза) лён, які карыстаўся асаблівым попытам на знешнім рынку, па белізне і даўжыні валакна не меў роўнага па якасці ў імператарскай Расіі і не саступаў бельгійскаму.

Усяго па падліках І. Грасманэ, з Беларусі ў Рыгу ў канцы XVIII – першай палове XIX стст. паступала, паводле даных афіцыйнай

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рэгістрацыі, 50 % таварнага льну. Галоўным рэгіёнам па вырошчванні льнянога валакна была Пскоўская губерня, аднак большасць пастаўшчыкоў льну пражывала ў гарадах Беларусі, таму дастаўляемы ў Рыгу лён з Пскоўскай, Смаленскай і іншых губерняў называўся беларускім. 30–40 % ад агульнай колькасці таварнага льну паступала з Літвы, 8 % з Курляндыі, 6–7 % з Ліфляндыі, Пскоўскай, Смаленскай губерняў [31, с. 176–177, 179–180, 181]. У 1838–1842 гг. з Беларусі ў Рыгу для наступнага замежнага гандлю штогод дастаўлялі ў сярэднім да 703 тыс. пудоў льну, ці амаль палову яго прывозу ў порт. У 1859–1862 гг. у структуры экспартных тавараў на долю лёну і паклі ў Віцебскай губерні прыпадала 18,75 % (найбольш значны паказчык у Валагодскай губерні – 50,46 %) [32, с. 157–160].

Такім чынам, з беларускага краю ў Рыгу ў 1810-х –1850-х гг. экспартавалася да 50 % таварнага льну агульнага аб'ёму прывозу ў гэты порт. На вывазе льну спецыялізавалася шэраг паветаў Віцебскай і Віленскай губерняў, прылеглых да воднага басейну Заходняй Дзвіны. Асаблівае значэнне для памешчыцкіх і сялянскіх гаспадарак мела рэалізацыя льну і льнянога семя для Віцебскай губерні, бо знешні гандаль льном і семем служыў гэтым саслоўям істотным сродкам для падтрымкі матэрыяльнага стану і атрымання грошай з мэтай выплаты дзяржаўных падаткаў.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник, издаваемый Императорским Русским географическим обществом. – СПб., 1854. – Вып. 2. – С. 111–268.
2. Чепко, В. В. Рост товарности помещичьего хозяйства Белоруссии в первой половине XIX в. / В. В. Чепко // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1962 г. / Акад. наук СССР, Акад. наук БССР ; ред.: В. К. Яцунский [и др.]. – Минск, 1964. – С. 389–397.
3. Чепко, В. В. Некоторые вопросы состояния хозяйства помещичьих крестьян в первой половине XIX века / В. В. Чепко // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1960 г. / Акад. наук СССР, Акад. наук УССР ; ред.: В. К. Яцунский [и др.]. – Киев, 1962. – С. 363–377.
4. Падбярэскі, Р. Лісты пра Беларусь / Р. Падбярэскі ; пер. з пол. М. Хаўстовіча // Шляхам гадоў : гіст.-літ. зб. / рэдкал.: Г. Кісялёў [і інш.]. – Мінск, 1994. – Вып. 4. – С. 249–266.
5. Гибер фон Грейфенфельс, И. Несколько данных к улучшению быта крестьян Витебской губернии / И. Гибер фон Грейфенфельс // Журнал землевладельцев. – 1859. – № 18. – С. 47–54.
6. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 1281. Оп. 4. Д. 80.
7. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Ковенская губерния / сост. Д. Афанасьев. – СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1861. – [2], X, XII, [1], 743, [3] с.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 2775.
9. Военно-статистическое обозрение Российской империи : [в 17 т.] / изд. при 1-м отд-нии Департамента Генер. штаба. – СПБ. : Тип. Департамента Генер. штаба, 1848–1858. – Т. 8, ч. 1 : Витебская губерния / сост. генерал-майор Без-Корнилович. – 1852. – 267 с.
10. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 21889.
11. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 20274.
12. Романовский, Н. Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX в.) / Н. Т. Романовский. – Минск : [б. и.], 1966. – 427 с.
13. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 4. Д. 46 а.
14. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 4. Д. 89 а.
15. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии: с привосокуплением и других сведений к ней же относящихся / сост. М. О. Без-Корнилович. – СПб. : Тип. 3-го Отд-ния собств. Е. и. вел. канцелярии, 1855. – 355 с.
16. Кернажыцкі, К. І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX ст.: да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі / К. І. Кернажыцкі. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1935. – 271 с.
17. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 125.
18. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 4. Д. 66.
19. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 6. Д. 81.
20. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распада феадалізма = Materials to the history of manufacture of White-Russia of the period of the downfall of feudalism : у 2 ч. / Беларус. акад. навук, Ін-т гісторыі ; адк. рэд. В. К. Шчарбакоў. – Менск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934–1935. – № 2 : [I. Статыстыка 1841–1864], [II. Урадавыя мерапрыемствы 1793–1861] / прадм. В. К. Шчарбакова. – 1935. – XXIII, 380 с.
21. Белоруссия в эпоху феодализма : сб. док. и материалов : [в 4 т.] / Акад. наук БССР, Ин-т истории, Арх. упр. МВД БССР. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1959–1979. – Т. 3 : Воссоединение Белоруссии с Россией и её экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX века (1772–1860) / сост.: В. В. Чепко, В. В.Шатилло. – 1961. – 626 с.
22. Раевский, М. Н. Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России : [в 2 ч.] / М. Н. Раевский. – СПб. : Тип. бр. Пантелеевых, 1874–1876. – Ч. 2 : Район Западной Двины и верховьев Днепра. – 1876. – IV, II, 129, 28 с. (168 с. разд. паг.).
23. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 975.
24. НГАБ у Гродне. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 561.
25. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Виленская губерния / сост. А. Корева. – СПб. : Тип. И. Огризко, 1861. – [VIII], [V], 804 с.
26. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 6. Д. 73.
27. Lietuvos Valstybės Istorios Archyvas (LVIA). – F. 378. Ap. 121. Bib. 379.
28. РГИА. – Ф. 1281. Оп. 5. Д. 80.
29. LVIA. – F. 388. Ap. 1. Bib. 249.
30. Неупокоев, В. И. Перестройка некоторых помещичьих хозяйств Литвы во второй трети XIX века / В. И. Неупокоев // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1961 г. / Акад. наук СССР, Акад. наук Латв. ССР ; ред.: В. К. Яцунский [и др.]. – Рига, 1963. – С. 331–348.
31. Грасмане, И. Э. Значение водного пути реки Даугавы в доставке экспортных товаров в Ригу в конце XVIII и первой половине XIX в. / И. Э. Грасмане // Экономические связи Прибалтики с Россией : сб. ст. / Акад. наук Латв. ССР, Ин-т истории ; ред. А. К. Бирон. – Рига, 1968. – С. 173–186.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

32. Обозрение внутреннего судоходства по рекам Европейской России в период 1859–1862 гг. // Сборник сведений и материалов по ведомству Министерства финансов. – 1866. – Т. 1, кн. 2. – С. 135–160.

References:

1. Animelle N. Everyday life of Belarusian peasants. *Ethnographic collection, published by the Imperial Russian Geographical Society*. St. Petersburg, 1854, iss. 2, pp. 111–268 (in Russian).

2. Chepko V. V. Growth of marketability of landowner economy in Byelorussia in the first half of the 19th century. *Yearbook on the agrarian history of Eastern Europe, 1962*. Minsk, 1964, pp. 389–397 (in Russian).

3. Chepko V. V. Some issues of the state of the economy of landowner peasants in the first half of the 19th century. *Yearbook on the agrarian history of Eastern Europe, 1960*. Kyiv, 1962, pp. 363–377 (in Russian).

4. Padbyareski R. Letters about Belarus. *Shlyakham gadou: gistoryka-litaraturny zbornik* [Through the years: a historical and literary collection]. Minsk, 1994, iss. 4, pp. 249–266 (in Belarusian).

5. Guiber von Greifenfels I. Some data on improving the life of peasants in Vitebsk province. *Zhurnal zemlevladel'tsev* [Journal of Landowners], 1859, no. 18, pp. 47–54 (in Russian).

6. *The Russian State Historical Archive (RGIA)*, coll. 1281, aids 4, fol. 80. (in Russian).

7. Afanas'ev D. (comp.). *Materials for geography and statistics of Russia, collected by officers of the General Staff. Kovno province*. St. Petersburg, Obshchestvennaya pol'za Publ., 1861. [2], X, XII, [1], 743, [3] p. (in Russian).

8. *The National Historical Archives of Belarus (NHAB)*, coll. 1297, aids 1, fol. 2775. (in Belarusian).

9. Bez-Kornilovich (comp.). *Military and statistical review of the Russian Empire. Vol. 8, part 1. Vitesk Province*. St. Petersburg, Printing House of the General Staff Department, 1852. 267 p. (in Russian).

10. *The National Historical Archives of Belarus*, coll. 1430, aids 1, fol. 21889. (in Belarusian).

11. *The National Historical Archives of Belarus*, coll. 1430, aids 1, fol. 20274. (in Belarusian).

12. Romanovskii N. T. *Development of manufactory industry in Byelorussia (second half of the 18th - first half of the 19th centuries)*. Minsk, 1966. 427 p. (in Russian).

13. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 4, fol. 46 a. (in Russian).

14. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 4, fol. 89 a. (in Russian).

15. Bez-Kornilovich M. O. (comp.). *Historical information about the most remarkable places in Byelorussia: with the addition of other information relating to it as well*. St. Petersburg, Printing Office of the 3rd Department of His Imperial Majesty's Own Chancellery, 1855. 355 p. (in Russian).

16. Kernazhytski K. I. *The serfs' farm in White-Russia in the end of XVIII century and the first half of XIX century: to the problem of the downfall of feudalism in Belarus*. Minsk, Publishing House of the Byelorussian Academy Science, 1935. 271 p. (in Belarusian).

17. *The National Historical Archives of Belarus*, coll. 2001, aids 1, fol. 125. (in Belarusian).

18. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 4, fol. 66. (in Russian).

19. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 6, fol. 81. (in Russian).

20. Shcharbakou V. K. *Materials to the history of manufacture of White-Russia of the period of the downfall of feudalism. Part 2. [I. Statistics 1841–1864], [II. Governmental activities 1793–1861]*. Minsk, Publishing House of the Byelorussian Academy Science, 1935. XXIII, 380 p. (in Belarusian).

21. Chepko V. V., Shatillo V. V. (comp.). *Byelorussia in the epoch of feudalism : collection of documents and materials. Vol. 3. Reunification of Byelorussia with Russia and its economic development in the late 18th - first half of the 19th century (1772–1860)*. Minsk, Publishing house of the Academy of Sciences of the BSSR, 1961. 626 p. (in Russian).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

22. Raevskii M. N. *Western region of the expedition to study the grain trade and productivity of Russia. Part 2. Region of the Western Dvina and the upper reaches of the Dnieper*. St. Petersburg, Panteleev Brothers Printing House, 1876. IV, II, 129, 28 p. (168 pagination pages). (in Russian).
23. *The National Historical Archives of Belarus*, coll. 2001, aids 1, fol. 975. (in Belarusian).
24. *The National Historical Archives of Belarus in Grodno*, coll. 1, aids 1, fol. 561. (in Belarusian).
25. Koreva A. (comp.). *Materials for geography and statistics of Russia, collected by officers of the General Staff. Vilna province*. St. Petersburg, I. Ogrizko Publ., 1861. [VIII], [V], 804 p. (in Russian).
26. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 6, fol. 73. (in Russian).
27. *Lietuvos Valstybės Istorios Archyvas (LVIA)* [Lithuanian State Historical Archives], coll. 378, aids 121, fol. 379. (in Lithuanian).
28. *The Russian State Historical Archive*, coll. 1281, aids 5, fol. 80. (in Russian).
29. *Lietuvos Valstybės Istorios Archyvas* [Lithuanian State Historical Archives], coll. 388, aids 1, fol. 249. (in Lithuanian).
30. Neupokoev V. I. Reorganisation of some landowners' holdings in Lithuania in the second third of the 19th century. *Yearbook on the agrarian history of Eastern Europe, 1961*. Riga, 1963. pp. 331–348 (in Russian).
31. Grasmane I. E. The importance of the Daugava River waterway in the delivery of export goods to Riga in the late 18th and first half of the 19th century. *Ekonomicheskie svyazi Pribaltiki s Rossiei: sbornik statei* [Economic ties of the Baltic States with Russia: collection of articles]. Riga, 1968, pp. 173–186 (in Russian).
32. Review of inland navigation on the rivers of European Russia in the period 1859-1862. *Sbornik svedenii i materialov po vedomstvu Ministerstva finansov* [Collection of information and materials on the department of the Ministry of Finance], 1866, vol. 1, bk. 2, pp. 135–160 (in Russian).

Дата паступлення артыкула 15.08.2025
Received 15.08.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 633.2.031:332.54:342.542.5«18/19»
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097934

А. А. Макарчык

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Мінск, Беларусь

ШТОГАДОВЫ ПЕРАДЗЕЛ СЯЛЯНСКІХ СЕНАКОСНЫХ УГОДДЗЯЎ НА БЕЛАРУСІ Ў XIX–XX СТСТ.

Анатацыя. Перадзел сенакосных угоддзяў з'яўляецца характэрнай рысай традыцыйнага грамадства, які захаваўся на Беларусі да XX ст. Кожны год грамада дзяліла сельскагаспадарчыя ўгоддзі паміж усімі сялянамі. У артыкуле канкрэтныя ўмовы перадзелу сенакосных угоддзяў беларускага сялянства ў часы Расійскай імперыі асвятляюцца на падставе апісання Аўгуста фон Гакстгаўзена, змешчанага ў даследванні "Исследования внутренних отношений народной жизни и в особенности сельских учреждений в России", падрыхтаванага па выніках здзейсненнага ў 1843–1844 гг. падарожжа па Расійскай імперыі. Прадстаўлены таксама прыклады, як адбывалася выдзяленне частак калгаснага сенакосу на патрэбы калгаснікам у савецкі перыяд.

Ключавыя словы: беларускае сялянства, сялянская грамада, перадзел сенакосу, Аўгуст фон Гакстгаўзэн (August von Haxthausen), традыцыйнае грамадства, аграрныя адносіны, калгаснае землекарыстанне.

Для цытавання. Макарчык, А. А. Штогадовы перадзел сялянскіх сенакосных угоддзяў на Беларусі ў XIX–XX стст. / А. А. Макарчык // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 19–26.

А. А. Макарчик

Белорусский государственный музей народной архитектуры и быта, Минск, Беларусь

ЕЖЕГОДНЫЙ ПЕРЕДЕЛ КРЕСТЬЯНСКИХ СЕНОКОСОВ В БЕЛАРУСИ В XIX–XX ВВ.

Аннотация. Передел сенокосов – характерная черта традиционного общества, сохранившегося в Беларуси до XX века. Ежегодно община делила сельскохозяйственную землю между всеми крестьянами. В статье конкретные условия передела сенокосных земель белорусского крестьянства в период Российской империи освещаются на основе описания Августа фон Гакстхаузена, содержащегося в исследовании «Исследования внутренних отношений народной жизни и в особенности сельских учреждений в России», подготовленного по результатам путешествия по Российской Империи в 1843–1844 гг. Также представлены примеры того, как части колхозного сена выделялись на нужды колхозников в советский период.

Ключевые слова: белорусское крестьянство, крестьянское общество, передел сенокосов, Август фон Гакстхаузен, традиционное общество, аграрные отношения, колхозное землепользование.

Aliaksandr A. Makarchyk

The Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle, Minsk, Belarus

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ANNUAL REDISTRIBUTION OF PEASANT HAYFIELDS IN BELARUS IN THE XIX-XX CENTURIES

Abstract. The redistribution of hayfields is a distinctive feature of traditional society, which was preserved in Belarus until the 20th century. Every year the community divided agricultural land among all peasants. The article highlights the specific conditions of redistribution of hay lands of the Belarusian peasantry in the period of the Russian Empire on the basis of August von Haxthausen's description contained in the study "Studies of the internal relations of folk life and especially rural institutions in Russia", prepared as a result of his journey around the Russian Empire in 1843-1844. It also presents examples of how portions of collective farm hay were allocated to the needs of collective farmers during the Soviet period.

Keywords: Belarusian peasantry, peasant society, redistribution of hayfields, August von Haxthausen, traditional society, agrarian relations, collective farm land use.

For citation. Makarchyk A. A. Annual redistribution of peasant hayfields in Belarus in the XIX-XX centuries. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 19–26 (in Belarusian).

З часоў першабытнага ладу грамада ўяўляла сабой першую форму сацыяльнай арганізацыі людзей. Спачатку гэта была крэўна-сваяцкая грамада, на змену якой прыйшла суседская, асаблівасцю якой стаў перадзел зямельных і сенакосных угоддзяў. У Заходняй Еўропе гэта традыцыя паступова знікла ў перыяд феадалізму. Сярод славянскага насельніцтва Усходняй Еуропы перадзел зямельных і сенакосных угоддзяў захаваўся да пачатку XX ст. і часткова працягваўся ўвесь савецкі перыяд.

Землі Беларусі ў адносінах перадзелу зямельных і сенакосных угоддзяў аказаліся ў пераходным становішчы. На захадзе і ў цэнтры Беларусі перадзел зямельных участкаў паступова знікаў, на змену яму прыходзіла падворнае землекарыстанне. Асабліва паспрыяла гэтаму аграрная рэформа "Устава на валокі" 1557 г. У пачатку XIX ст. на ўказаных землях перадзел не існаваў. А на ўсходніх землях Беларусі, якія прымыкалі да Расіі, перадзел зямельных участкаў існаваў да пачатку XX ст. У пачатку 1920-х гадоў на тэрыторыі Беларусі перадзел зямлі ўжо не адзначаўся [1, с. 23]. Традыцыя перадзелу сенакосаў у Беларусі існавала паўсюдна і дайшла да XX ст. Яна захавалася нават у савецкі час, нягледзячы на тое, што калгасная практыка змагалася з любымі "прыватнаўласніцкімі" праявамі сялянства.

У савецкі перыяд даследчыкамі гісторыі не асвятляўся такі важны і цікавы бок жыцця сялянскай зямельнай грамады, як перадзел зямлі, бо ён пярэчыў сцвярджэнню аб значнай маёмаснай дыферэнцыяцыі сялянства. Гэта магло прывесці да думкі аб тым,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

што сялянская грамада паспрыяла ўстанаўленню калгаснага ладу. Невыпадкова некаторыя даследчыкі, напрыклад, С. М. Дуброўскі, спецыяльна падкрэслівалі: “Ни в коем случае нельзя говорить, что будто бы община явилась основой для перехода к социализму” [2, с. 195].

Перадзел зямельных угоддзяў з’яўляецца даволі вялікай тэмай, таму спынімся толькі на перадзеле сенакосных угоддзяў. Галоўная прычына перадзелу выходзіла з самой сутнасці сялянскай грамады, у якой усе члены павінны быць роўнымі паміж сабой і юрыдычна, і эканамічна. Маёмасная роўнасць была важнейшым фактарам. Таму грамада моцна трымалася за так званую “старыну”, гэта значыць за традыцыі перадзелу, якія паходзілі з глыбокай старажытнасці. Таксама перадзел тлумачыўся аб’ектыўнымі фактарамі: якасць натуральных сенакосаў залежыла ў значнай ступені ад умоў надвор’я і адлегласці ад вёскі. Напрыклад, у даждлівае лета ўчасткі сенакосу ў нізінах затапляліся вадой, а на ўзвышшы сакавітая трава расла густой і высокай, і наадварот – у засушлівае лета. Перавагу мелі тыя сяляне, каму даставаліся ўчасткі побач з вёскай. Перашкаджалі сенакосу і кратовыя горкі, якіх было шмат на незатапляльных вадой месцах. Таму для справядлівасці кожны год ладзіўся поўны перадзел сенакосаў паміж усімі, без выключэння, членамі сялянскай грамады.

Перадзел тычыўся толькі сенакосаў, якія ў сілу даўнасці (“старыны”) былі замацаваны за сялянскай грамадой. У першай палове XIX ст. “в среднем помещичьи сенокосы составляли не менее 30% всех сенокосов…Наибольший размер помещичьи сенокосы достигали в Гродненской и Минской губерниях, в первой из них в подавляющем большинстве имений (главным образом крупных и средних) сенокосы помещика составляли 45–55% всех сенокосных земель” [3, с. 16].

Для таго, каб зразумець, наколькі цяжкая была задача для селяніна даіндустрыяльнай эпохі падзяліць вялікую плошчу сенакосу на роўныя ўчасткі, неабходна звярнуцца да разгляду яго арыфметычных магчымасцей. У сялян, як адзначыў С. В. Міронаў: “Абстрактное мышление слабо развито, индивид может оперировать информацией, почерпнутой почти исключительно из своего жизненного опыта и в рамках этого опыта” [4, с. 1047]. Таму арыфметычныя дзеянні, нават самыя простыя, выклікалі цяжкасці ў

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

селяніна. Жанчыны за рэдкім выключэннем лічылі на пальцах і да дзесяці.

Але непісьменныя сяляне стараліся прыстасавацца да патрабаванняў часу і знаходзілі выйсце. А. Н. Энгельгардт (1832–1893) у сваіх “Письмах из деревни” распавядае: “Иван грамоте не знает, писать не умеет, а между тем он заведует амбарами, принимает и отпускает хлеб, сало, масло, крупу, жмыхи, считает летом сено, навоз, снопы и пр. и пр… Все свои счёты Иван отмечал, зарезывая прежде на бирках, то есть четырохгранных палочках, которые у него имелись отдельные для каждого предмета…” [Цыт. па: 4, с. 1048–1049]. Вядома, такі спосаб уліку мог выкарыстоўвацца толькі на кароткі тэрмін.

Цяпер уявіце сітуацыю, што сялянская грамада мела некалькі сенакосных угоддзяў складанай геаметрычнай формы, пасярод якіх былі азёрцы і балотцы, хмызнякі і дрэвы. (Гісторык Мікола Улашчык успамінае, што ў іх краях участак сенажаці называўся “Штаны”, і ён сваёй формай сапраўды нагадваў штаны [5, с. 38–39]). Да таго ж, трава па якасці на розных участках адрознівалася, прычым даволі значна. Усё гэта трэба было па магчымасці ўлічыць і падзяліць на аднолькавыя участкі, колькасць якіх магла быць да ста і нават болей. Для непісьменных сялян, якія ў большасці сваёй не ведалі дзяржаўных вымярэнняў, задача была архіскладаная.

Цікавая заўвага ў сур’ёзным навуковым апісанні нямецкага падарожніка Аўгуста фон Гакстгаўзена дае адказ на пытанне, як сялянская грамада дзяліла сенакос. Аўгуст фон Гакстгаўзэн (August von Haxthausen, 1792–1866) , нямецкі вучоны і падарожнік, яскравая і неардынарная асоба ў гісторыі XIX ст. Яго імя як даследчыка аграрных адносін добра вядома ў навуцы. У 1843–1844 гг. ён здзейсніў падарожжа па Расійскай імперыі і выдаў трохтомнае сачыненне “Studien über die innerlichen Verhaeltnisse des Volksleben und insbesondere die läendlichen Einrichtungen Russlands”. Першыя два тамы выйшлі на нямецкай мове ў 1847 г., трэці том – у 1852 г. У хуткім часе з’явіўся французскі варыянт. Паколькі Гакстгаўзен крытыкаваў прыгонны стан і недасканаласць эканомікі Расіі, таму на рускай мове пэўны час яго праца не выдавалася. Толькі ў 1870 годзе выйшлі два першыя тамы адной кнігай пад назвай “Исследования внутренних отношений народной жизни и в особенности сельских учреждений в России” [6]. Трэці том “Studien” на рускую мову не перакладаўся.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Выхад з друку даследавання Аўгуста фон Гакстгаўзена стаў важнай падзеяй не толькі для замежнага чытача, але і для рускага, асабліва для ліберальна настроенай часткі грамадства. Дастаткова спаслацца на выказванні У. І. Леніна і К. Маркса. У. І. Ленін наогул назваў Аўгуста фон Гакстгаўзена першым даследчыкам, які адкрыў свету рускую сялянскую грамаду [7, с. 407]. Карл Маркс у лісце ў рэдакцыю часопіса "Отечественные записки", маючы на ўвазе А. І. Герцэна, заўважыў з іроніяй, што апошні "открыл русскую общину не в России, а в книге прусского регирунгсрата Гакстгаузена" [8, с. 116]. Такую высокую ацэнку сачыненне Аўгуста фон Гакстгаўзена атрымала за багацце фактычнага матэрыялу гаспадарчага, культурнага, побытавага характару. Не будзе перабольшваннем сказаць, што гэта было першае маштабнае і кампетэнтнае навуковае даследаванне Расіі і рускага народа. Аўгуст фон Гакстгаўзен апісаў не толькі рускі народ, але і ўкраінцаў, фіна-ўгорскія і цюркія народы, землі якіх наведваў. З нямецкай грунтоўнасцю і дасканаласцю ён апісаў раскольнікаў, іх секты і разгалінаванні.

Шкада, што Беларусь Аўгуст фон Гакстгаўзен не наведваў. Інфармацыя аб Беларусі і Літве з'яўляецца эпізадычна і часцей у якасці параўнання з іншымі землямі. Але нягледзячы на гэта, часам сустракаецца надзвычай важная інфармацыя.

Вось як апісвае Аўгуст фон Гакстгаўзен падзел сенакосу на дзялянкі: "Белоруссы в деревнях близ местечка Усвята в Велижском уезде Витебской губернии, поступают таким образом: деревня делится на 2 половины, и каждая половина выбирает от себя по одному человеку, которым поручает делёж сенокосов. Эти двое выборные обхаживают все покосы деревни, осматривают их, наконец один из них, без малейшего вмешательства другого, делит все покосы на 2 части и другой выбирает любую их них. Затем каждая половина крестьян делится опять на 2 части, выбирающая по одному человеку от себя, и опять один делит, другой выбирает любую половину и т.д. Такой делёж называтся у них любки" [9, с. 346]. Тут неабходны каментарый. Той чалавек ад сялянскай грамады, які дзеліць сенакос на дзве паловы, стараецца максімальна правільна правесці падзел, бо ён не ведае, якая палова дастанецца яму. Выбіраць будзе другі чалавек, і калі той убачыць, што сенакос падзелены нераўнамерна, то абавязкова выбера лепшую палову сенакосу.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Другі спосаб падзелу сена – натурай, які апісвае Аўгуст фон Гакстгаўзен: “Ещё интереснее делёж покосов в селе Покровском, Покровского уезда Владимирской губернии. Там крестьяне делят между собою покосы, принимая в расчёт не то, чтобы пришлось на душу по равному количеству сена, а чтобы на каждого работника приходилось равное количество труда. Затем скошенное сено делят между собой натурой, возами” [9, с. 346–347]. Шкада, што пры апісанні гэтага спосабу падзелу, Аўгуст фон Гакстгаўзен не раскрывае падрабязнасці. З апісання бачна, што існавалі два спосабы перадзелу сенакосу: перадзел плошчы і дзяльба гатовага сена вазамі. У другім выпадку ўзнікалі пэўныя цяжкасці. За кожным селянінам (а іх было некалькі дзясяткаў) неабходна весці ўлік часу працы і вылічваць колькасць вазоў, яму прызначаных.

Пададзеная Аўгустам фон Гакстгаўзенам інфармацыя аб перадзеле сенакосных угоддзяў даволі цікавая, асабліва аб першым спосабе. Толькі народная мудрасць змагла выпрацаваць такі, безумоўна, арыгінальны, справядлівы, непадкупны спосаб перадзелу.

Апасля ўборкі ўгоддзі выкарыстоўваліся для выгану свойскай жывёлы. Таму прызначаную дзялянку сенакосу неабхобна было скасіць і звесці сена да канкрэтнага тэрміну. Другі або трэці ўкос сена на Беларусі амаль не праводзіўся. На некаторых сенакосных угоддзях пад восень, дзе мала пасвіўся статак свойскай жывёлы, вырастала невысокая і рэдкая трава, якая называлася атава. Яе касілі пры вострай неабходносці без усялякага кантролю з боку грамады. Укос быў нязначны.

Калі характарызаваць практыку надзялення сенакосамі сялян у савецкі перыяд, то няправільна будзе сказаць, што сяляне дзялілі сенакосныя ўгоддзі. Усе сенакосы належалі дзяржаве. Калгас выдзяляў селяніну невялікі ўчастак, на якім можна было нарыхтаваць максімум восем ці дзевяць вазоў сена. Такой колькасцю сена можна было карміць на працягу года адну карову і цялушку. У большасці сялян укос складаў 5–7 вазоў сена за лета: акурат для адной каровы. Сабраныя ўласна аўтарам звесткі сучаснікаў сведчаць, як адбываўся падзел сенакосу ў 50–80 гг. XX ст. у першай брыгадзе калгаса “Вялікі Кастрычнік” Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Пры першым сенакосе з дапамогай палявога цыркуля праводзіліся 3 лініі па 100 метраў шырынёй кожная. Лінія разбівалася на аднолькавыя ўчасткі па 20 сотак, гэта

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

значыць даўжыня ўчастка была 100 метраў, а шырыня 20 метраў. У зямлю ўтыкалі калок або проста галінкі з надпісаным нумарам участка. Прычым, калі на лініі былі хмызнякі, балота або нават невялікае азярцо, то гэтую перашкоду не абыходзілі, а ўключалі ва ўчастак. Затым праводзілася жараб'ёўка, пры якой усе калгаснікі цягнулі з шапкі папяровыя квіткі з нумарам участка. Таму было невядома, хто ў каго будзе суседам па сенакосе. Калі каму-небудзь трапляў вельмі кепскі выбар, напрыклад, значную частку сенакосу займала балота ці возера, то адказны за размеркаванне ўчасткаў надзяляў няўдачніка яшчэ сенакосам у іншым месцы, гэта значыць даваў яму яшчэ сотак пяць або дзесяць. Вядома, што падобнае дадатковае надзяленне суправаджалася спрэчкамі, бо памер дадатковага сенакосу быў абмежаваны, а незадаволеных заўсёды было шмат.

Пры другой чарзе выдзялялі сенакос у адпаведнасці з колькасцю працадзён, налічаных калгасніку на працягу года. Дадавалі сенакос і за здадзенае дзяржаве малако, за праполку і ўборку буракоў, кармавых ці цукровых. У каго дадаткова атрымлівалася трыццаць сотак, у каго толькі дзесяць. Пры такім надзяленні ўчасткі ішлі па спісе, гэта значыць па чарзе, ад аднаго двара да другога. Як і раней, у зямлю ўтыкалі калкі або галінкі, але ўжо з надпісаным прозвішчам калгасніка. Калі былі незадаволеныя тым, што дастаўся кепскі ўчастак, стараліся дадаць сотак пяць, а то і болей дзесьці ў кутку сенакосу.

Сам падзел сенакосу на ўчастках патрабаваў спрыту. Патрэбна было роўна правесці мяжу на сенакосе. Для гэтага адзін касец станавіўся з паднятай касой у адным канцы ўчастка, а другі касец з другога канца рухаўся яму насустрач. Той касец, які рухаўся насустрач першаму касцу, не павінен быў глядзець сабе пад ногі, а толькі пазіраў на метку, гэта значыць на першага касца з паднятай касой, і такім чынам таптаў мяжу ў траве. Атрымлівалася роўная стомятровая сцежка, якая і служыла мяжой.

Такім чынам, перадзел сенакосных угоддзяў быў важнай часткай жыцця беларускага сялянства. Штогадовы перадзел існаваў на працягу стагоддзяў, пры гэтым яго непасрэднае ажыццяўленне не было аднолькавым, а мела рэгіянальныя адметнасці і абумоўлівалася асаблівасцямі аграрных адносін у розныя гістарычныя перыяды.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Ходзін, С. М. Нацыянальныя традыцыі як фактар развіцця мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў 1920-я гг. / С. М. Ходзін // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст. : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 ліст. 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 20–27.
2. Дубровский, С. М. Сельское хозяйство и крестьянство России в период империализма / С. М. Дубровский. – М. : Наука, 1975. – 398 с.
3. Чепко, В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1966. – 220 с.
4. Миронов, Б. Н. Познавательные способности русских крестьян доиндустриальной эпохи / Б. Н. Миронов // Вестник Санкт-Петербургского университета. История. – 2018. – Т. 63, № 4. – С. 1047–1081. https://doi.org/10.21638/11701/spbu02.2018.405
5. Улашчык, М. М. Была такая вёска : гіст.-этнагр. нарыс / М. М. Улашчык. – Мінск : Мастац. літ., 1989. – 174 с.
6. Авдеева, О. А. Август фон Гакстгаузен и его труды о России, 40-е - 60-е годы XIX века : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.00 / Авдеева Оксана Александровна ; Моск. гос. ун-т. – М., 1998. – 175 с.
7. Ленин, В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. / В. И. Ленин ; Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Изд. 5-е. – М. : Изд-во полит. лит., 1967–1975. – Т. 1 : 1893–1894. – 1967. – 662 с.
8. Маркс, К. Письмо в редакцию «Отечественных записок» / К. Маркс // Сочинения / К. Маркс, Ф. Энгельс. – Изд. 2-е. – М., 1961. – Т. 19. – С. 116–121.
9. Гакстгаузен, А. фон. Исследования внутренних отношений народной жизни и в особенности сельских учреждений России / А. Гакстгаузен ; пер. с нем. и изд. Л. И. Рагозин. – М., 1870. – Т. 1. – XXII, 490 с

References:

1. Khodzin S. M. National traditions as a factor in the development of modernization processes in Belarus in the 1920s. *Farmiravanne belaruskai dzyarzhaunastsi va umovakh geapalitychnykh zrukhau XX st.: materyyaly mizhnarodnai navukovai kanferentsyi, Minsk, 29–30 listapada 2018 g.* [Formation of Belarusian statehood in the context of geopolitical shifts of the twentieth century: proceedings of the international scientific conference, Minsk, November 29–30, 2018]. Minsk, 2018, pp. 20–27 (in Belarusian).
2. Dubrovskii S. M. *Russian agriculture and peasantry in the period of imperialism*. Moscow, Nauka Publ., 1975. 398 p. (in Russian).
3. Chepko V. V. *Agriculture of Belarus in the first half of the 19th century*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1966. 220 p. (in Russian).
4. Mironov B. N. Intellectual abilities of Russian peasants of the pre-industrial era. *Vestnik Sankt-Peterburgskogo universiteta. Istoriya = Vestnik of Saint Petersburg University. History*, 2018, vol. 63, no. 4, pp. 1047–1081 (in Russian). https://doi.org/10.21638/11701/spbu02.2018.405
5. Ulashchik M. M. *There was such a village: a historical and ethnographic essay*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1989. 174 p. (in Belarusian).
6. Avdeeva O. A. *August von Haxthausen and his writings on Russia, the 40s-60s of the 19th century*. Ph.D. Thesis. Moscow, 1998. 175 p. (in Russian).
7. Lenin V. I. *Complete works: in 55 volumes. Vol. 1: 1893–1894*. 5th ed. Moscow, Political Literature Publishing House, 1967. 662 p. (in Russian).
8. Marx K. Letter to the editorial board of "Fatherland Notes". *Works of K. Marx and F. Engels. Vol. 19*. 2nd ed. Moscow, 1961, pp. 116–121 (in Russian).
9. Haxthausen A. von. *Studien über die innern Zustände, das Volksleben und insbesondere die ländlichen Einrichtungen Russlands. Bd. 1*. Hannover, Hahn'schen Buchhandlung, 1847. XX, 492 p. (in German).

Дата паступлення артыкула 11.08.2025
Received 11.08.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 271.22-75:638.1(091)(476)«1914/1918»
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097936

С. В. Мяньчэня

Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка ім. І.С. Лупіновіча Нацыянальнай акадэміі наук Беларусі, Мінск, Беларусь

ПРАЕКТ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ ПА РАЗВІЦЦЮ ПЧАЛЯРСТВА ПАД ЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І СПРОБЫ ЯГО РЭАЛІЗАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ МЯСЦОВЫХ ЕПАРХІЯЛЬНЫХ ВЕДАМАСЦЕЙ)

Анатацыя. З пачаткам Першай сусветнай вайны Расійская Імперыя сутыкнулася з недахопам матэрыялу для вырабу свечак, пераважная колькасць якога да вайны пастаўлялася з Германіі. Для вырашэння гэтай праблемы Праваслаўная царква распрацавала праграму развіцця пчалярства і пчалярскай адукацыі: прапагандавалася ідэя стварэння прыхадскіх і епархіяльных пчальнікоў, быў распрацаваны вучэбны курс для царкоўных навучальных устаноў. Аднак неспрыяльныя фактары – баявыя дзеянні, значныя фінансавыя выдаткі і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. – не дазволілі рэалізаваць гэты праект.

Ключавыя словы: пчалярства, Першая сусветная вайна, Праваслаўная царква, “свячны голад”, царкоўна-прыхадскія школы.

Для цытавання. Мяньчэня, С. В. Праект Праваслаўнай царквы па развіццю пчалярства пад час Першай сусветнай вайны і спробы яго рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі (па матэрыялах мясцовых епархіяльных ведамасцей) / С. В. Мяньчэня // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 27–35.

С. В. Меньченя

Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

ПРОЕКТ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ ПО РАЗВИТИЮ ПЧЕЛОВОДСТВА В ГОДЫ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ И ПОПЫТКИ ЕГО РЕАЛИЗАЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (ПО МАТЕРИАЛАМ МЕСТНЫХ ЕПАРХИАЛЬНЫХ ВЕДОМОСТЕЙ)

Аннотация. С началом Первой мировой войны Российская империя столкнулась с нехваткой материала для изготовления свечей, подавляющее большинство которого поставлялось до войны из Германии. Для решения этой проблемы Православная церковь разработала программу развития пчеловодства и пчеловодческого образования: продвигалась идея создания приходских и епархиальных пасек, был разработан учебный курс для церковных учебных заведений. Однако неблагоприятные факторы – военные действия, значительные финансовые затраты и революционные события 1917 года – не позволили реализовать этот проект.

Ключевые слова: пчеловодство, Первая мировая война, Православная церковь, “свечной голод”, церковно-приходские школы.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Siarhej V. Mianchenya

I.S. Lupinovich Belarus Agricultural Library of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

THE PROJECT OF THE ORTHODOX CHURCH TO DEVELOP BEEKEEPING DURING THE FIRST WORLD WAR AND ATTEMPTS TO IMPLEMENT IT ON THE TERRITORY OF BELARUS (BASED ON THE MATERIALS OF LOCAL DIOCESAN BULLETINS)

Abstract. With the outbreak of World War I, the Russian Empire faced a shortage of candle-making material, the vast majority of which had been supplied before the war from Germany. To solve this problem, the Orthodox Church developed a program for the development of beekeeping and beekeeping education: the idea of creating parish and diocesan apiaries was promoted, and a training course for church educational institutions was developed. However, unfavourable factors such as military operations, significant financial costs and the revolutionary events of 1917 made it impossible to implement this project.

Key words: beekeeping, World War I, Orthodox Church, “Candle Famine”, parish schools.

For citation. Mianchenya S. V. The project of the Orthodox Church to develop beekeeping during the First World War and attempts to implement it on the territory of Belarus (based on the materials of local diocesan bulletins). Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 27–35 (in Belarusian).

На пачатак XX ст. Германія з’яўлялася фактычна галоўным гандлёвым партнёрам Расійскай Імперыі, негледзячы на эканамічныя і палітычныя разнагалоссі ў стасунках дзвух дзяржаў. Адным з артыкулаў расійскага імпарта быў матэрыял для вырабу свечак. Пры гэтым воск для Люнебургскай воскабялільні, што знаходзілася каля Гамбурга, закупляўся ў Расіі, затым змешваўся з хімічнымі рэчывамі, адбельваўся і трапляў на расійскія свячныя заводы [1, с. 71–72]. Кошт тавара, які такім чынам праходзіў праз Гамбурскі порт, дасягаў 5 млн руб. у год [2, с. 17]. Так, Гродзенскі епархіяльны свячны завод у 1913 г. закупіў замежнага воска на 27 403 руб., пры агульных выдатках на воск у 46 973 руб. [3, с. 439–441]. З пачаткам Першай сусветнай вайны эканамічныя сувязі былі па зразумелых прычынах разарваны, а ў Расійскай Імперыі склалася сітуацыя, якая атрымала назву “свячны голад”.

Пры адсутнасці дастатковай колькасці сыравіны кошт за свечкі значна вырас, а іх памер зменшыўся, святараў і прыхажан заклікалі да эканоміі [1, с. 72]. Сітуацыю, пры якой на рынку воска фактычна ўзнікла і дзейнічала нямецкая манаполія, спрабавалі патлумачыць карупцыяй сярод кіраўніцтва епархіяльных свячных заводаў. Так, у “Полацкіх епархіяльных ведамасцях” быў надрукаваны афіцыйны

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

адказ на артыкул “Нового Времени” аб атрыманні шэрагам, звязаных з свячнымі заводамі асоб, у тым ліку майстрам Віцебскага епархіяльнага завода З. Царовым, віншаванняў на святы з грашовымі пераводамі ў дзесяць рублёў ад Люнебургскай фірмы. У адказе адзначалася, што калі майстар і атрымліваў такія “падарункі”, то як прыватная асоба, аб чым кіраўніцтва завода не ведала, а на памеры паставак і якасць прадукцыі гэта ніяк не ўплывала [4, с. 340].

У жніўні 1915 г. указам імператара абвяшчалася неабходнасць увогуле адмовіцца ад адбельвання воска і выкарыстоўваць натуральны матэрыял, які з’яўляецца больш кананічным, што дазволіць не толькі эканоміць сродкі і сыравіну, але і значна спрасціць справаздачу свячных заводаў [5, с. 250–251]. Сінод разпрацоўвае сістэму мерапрыемстваў для пераадолення “свячнога голада”, накіраваных на развіццё мясцовага пчалярства: праз далучэнне да яго саміх святароў і стварэнне вучэбных пчальнікоў пры царкоўна-прыхадскіх школах, выдачы крэдытаў пчалярскім гаспадаркам, забарону пасрэдніцкай дзейнасці з мэтай недапушчэння спекуляцыі [6, с. 27–28]. Пры гэтым асноўная дзейнасць пчалярскіх гаспадарак павінна была быць накіравана менавіта на здабычу воска, а не мёда.

У справе практычнай рэалізацыі развіцця пчалярства епархіям прапаноўнавалася ствараць буйныя пчальнікі на 200–300 вульёў непадалёк ад свячных заводаў, набыўшы для гэтай патрэбы асобны хутар. З крытыкай гэтай прапановы выступіў аўтар артыкула “Церковная пасека”, які быў змешчаны ў “Мінскіх епархіяльных ведамасцях”, а затым перадрукаваны ў “Полацкіх…” [6]. У першую чаргу адзначалася малая эфектыўнасць буйных пчальнікоў: абмежаванасць узятка для пчолаў дазволіць ёй выйсці на памеры толькі ў 10–12 пудоў воска ў год. Па-другое, адзначалася, што такі праект патрабуе значных сродкаў, а таму фінансава стратны. Аднак такія буйныя пчальнікі маглі прынесці карысць у арганізацыйным плане, як навучальныя і навуковыя цэнтры. Аўтар прапанаваў ствараць пчальнікіі пры кожным прыходзе, адмовіўшыся ад рамавых вульёў на карысць калод-дуплянак. Акрамя перавагі ў фінансавым плане (яны больш танныя і простыя ў абслугоўванні), калоды даюць значна больш воска чым вуллі [7, с. 417]. У мэтах эканоміі прапаноўвалася змяшчаць такія пчальнікі на могілках пасля іх упарадкавання (агароджа, сцежкі, кветнікі, высадка дрэваў).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Сродкі на гэтыя мерапрыемствы павінны былі паступіць ад платы за месца для пахавання – 1 руб. за дарослае і 50 кап. за дзіцячае. У якасці даглядчыкаў і вартаўнікоў разглядаліся кандыдатуры інвалідаў вайны. Пры гэтым агульныя выдаткі на арганізацыю пчальнікоў аўтар ацэньваў ад 30 да 100 руб. Асноўнымі праблемамі яму бачыліся цяжкасці ў набыцці дуплянак і раёў, аднак тут на дапамогу прыходам павінен быў прыйсці ўзорны епархіяльны пчальнік [7, с. 416–418].

Падрыхтоўку будучых пчаляроў павінны былі ажыццяўляць царкоўна-прыхадскія школы. Трэба адзначыць, што ў гэтай справе ўжо меўся пэўны досвед, аднак справа з большага трымалася на асобных энтузіастах і не насіла сістэмнага характару. Так у 1913–1914 навучальным годзе ў Гродненскай губерні заняткі па пчалярству праводзіліся ў Дойлідскай мужчынскай школе Беластоцкага павета настаўнікам С. Канцэвічам (сёння ў межах Беластока, Польшча), Дзятлаўскай узорнай (суч. – г. Дзятлава, Гродзенская вобл.), Магіліцкай (суч. – в. Магіліцы, Івацэвіцкі раён), Нагародзіцкай (суч. – в. Нагародавічы, Дзятлаўскі раён), Краснастоцкай жаночай школе Сакольскага павета (суч. – Ружаныcток, Польшча) [8, с. 20–22]. У Віцебскай губерні такія заняткі праводзіліся ў Лужаснянскай школе (суч. – в. Лужасна, Віцебскі раён) [9, с. 39], Обаль-Ануфрыеўскай (суч. – г. п. Обаль, Шумілінскі раён) і Турычынскай (суч. – в. Турычына, Невельскі райн, Расійская федэрацыя) школах [10, с. 84–86]. У Магілёўскай губерні з асновамі пчалярства можна было азнаёміцца ў школе пры Пустынскім манастыры Мсціслаўскага павета (суч. – в. Пустынкі, Мсціслаўскі раён) [11, с. 569]. Як бачна, значная колькасць школ, у якіх праводзіліся заняткі па пчалярству, знаходзілася на захадзе Беларусі і да восені 1915 г. патрапіла ў зону германскай акупацыі.

Для суправаджэння гэтага працэса быў створаны часопіс “Обучение пчеловодству в церковно-приходской школе”, рэдакцыя якога знаходзілася ў Адэсе. Мэтай часопіса з’яўлялася “обеспечить Святой Русской Православной Церкви добычу воска в России для церковных свечей” [2, с. 17]. На старонках часопіса чытачы маглі азнаёміцца з практычнымі рэкамендацыямі аб арганізацыі пчальніка і дзейнасці пчалярскай гаспадаркі, знакамітымі пчалярамі, поспехамі асобных школ, прадугледжвалася і зваротная сувязь –

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

адказы на пытанні чытачоў. Заклік аформіць падпіску на часопіс з'явіўся на старонках мясцовых епархіяльных ведамасцей.

У лютым 1916 г. Сінод зацвердзіў правілы выкладання і праграму курса пчалярства. Галоўная задача курса пазначалася як удзел школ ў забеспячэнні епархіяльных свячных заводаў воскам. У царкоўна-настаўніцкіх школах, якія рыхтавалі кадры для царкоўна-прыхадскіх школ і школ граматы, выкладчыкамі павінны былі з'яўляцца тэхнікі пчалярства з ліку служачых Дэпартамента земляробства, прыналежныя да праваслаўнай канфесіі і ўзгодненыя Сінадальным вучылішчным саветам. Заробак такіх асоб у памеры ад 600 да 900 руб. у год выплочваўся Дэпартаментам земляробства, а сродкі на кватэру і ацяпленне давала школа. На арганізацыю пчальнікоў павінна было выдаткоўвацца 500 руб. на школу. Два ўрока на тыдзень адводзілася на тэарэтычныя заняткі ў першым класе, а практычныя – для ўсіх навучэнцаў. Пры гэтым адзін з класаў павінны быў заставацца ў школе на летні перыяд да сярэдзіны ліпеня (канец перыяда масавага ўзятка). Асобы, якія скончылі школу, атрымлівалі зробленыя імі пад час вучобы вуллі і пчалярскія прылады для агранізацыі пчальнікоў на месцах будучай працы [12, с. 257–259]. У другакласных і царкоўна-прыхадскіх школах весці заняткі па пчалярству павінны былі мясцовыя настаўнікі, для якіх Дэпартамент земляробства і Сінадальны савет арганізоўвалі летнія курсы. Дадатковы заробак настаўнікам выплочваўся таксама Дэпартаментам земляробства: 120 руб. у год для другакласных школ і 60 руб. – для царкоўна-прыхадскіх. На арганізацыю пчальнікоў гэтыя школы атрымлівалі па 300 і 100 руб. адпаведна. Настаўнік царкоўна-прыхадской школы, які вёў заняткі па пчалярству, атрымліваў яшчэ і даход ад продажу воска, частка мёда ішла на продаж, каб пакрыць выдаткі пчальніка, астатняя перадавалася вучням у якасці ўзнагароды і сродка заахвочвання [13, с. 286–288].

Для царкоўна-настаўніцкіх школ прадугледжвалася грунтоўная праграма па асновам пчалярства. Тэарэтычны яе блок змяшчаў раздзелы аб анатамічнай будове пчол, структуры пчалінай сям'і, жыцці і дзейнасці пчол, асаблівасцях борцей, калод-дуплянак і вуллёў розных сістэм, пчалярскіх прыладах, арганізацыі пчальніка, даглядзе пчол напрацягу года і іх зімоўцы, натуральным і штучным раенні пчол, медазборы, хваробах пчол, карысці і ўласцівасцях мёда, воска і меданосных раслін. Практычныя заняткі – два ўрока на

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

тыдзень – пачыналіся ў летні перыяд. Пад час іх навучэнцы павінны былі азнаёміцца з поўным цыклам працы: ад правілаў выбару месца для пчальніка і размяшчэння вулляў, да адбору воска і мёда [14, с. 58–63]. Падобная праграма павінна была ўжывацца для настаўніцкіх курсаў, пры гэтым рабілася карэкціроўка на час іх правядзення: калі пэўная аперацыя з пчоламі не адпавядала сезону, то гэтая тэма пераносілася з практычнай у тэарэтычную частку [14, с. 65–70].

Праграма для царкоўна-прыхадскіх школ выглядала хутчэй як прыкладная, з падзелам на два блока – зімовы і летні. У зімовы перыяд настаўнік павінны быў праводзіць гутаркі з вучнямі і чытанні пчалярскай літаратуры, з дапамогай табліц павелічальнага шкла і макетаў азнаёміць вучняў з анатоміяй пчалы. На практычных занятках вучням прапаноўвалася вырабляць пчалярскія прылады: сеткі, раёўні, саламяныя кашы і нават вуллі. У летні перыяд асноўная частка заняткаў праходзіла на пчальніку, па зместу яны амаль паўтаралі праграму для царкоўна-настаўніцкіх школ, пры гэтым вучні павінны былі весці назіранні за пчоламі і за надвор'ем, робячы адпаведныя запісы ў пчалярскі дзённік [14, с. 64].

Для ўсіх трох тыпаў вучэбных устаноў была падрыхтавана падрабязная смета выдаткаў на закупку абсталявання для пчальнікоў на вызначаную вышэй суму – 500, 300 і 100 руб. адпаведна. Для царкоўна-настаўніцкіх школ прадугледжвалася закупка 8 рамачных вулляў розных сістэм (Лявіцкага, Дадана-Блата, Рута-Лангстрота і Лайянса), 15 калод з пчоламі, матэрыяла для вырабу вульёў, сталярных і пчалярных прыладаў, насення меданосных раслін, бібліятэкі. Аснову пчальнікоў другакласных школ павінны былі скласці 15 вульёў, пераважна сістэмы Дадана-Блата, і адзін вулей для назірання за пчоламі. Тут адсутнічалі выдаткі на літаратуру, значна менш выдаткоўвалася на інструменты і насенне. Царкоўна-прыхадская школа павінна была пачынаць з 5 вуллёў і 3 пчаліных сямей. У суму 100 руб. не ўвайшлі выдаткі на вулей для назірання за пчоламі, дзесяцічныя шалі і прэс для воска, таму аптымальным лічылася дадатковае выдаткованне грошай яшчэ на 28 руб [14, с. 71–74].

Дапамагчы мясцовым школам і мясцовым святарам у справе развіцця пчалярства павінны былі епархіяльныя крамы. Так, Магілёўская епархіяльная крама прымала замовы на выраб вуллёў

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сістэмы Дадана-Блата (выраблялiся ў Петраградзе), ажыццяўляла продаж пчалярскiх прылад [15, с. 17].

“Епархiяльныя ведамасцi” аказвалі інфармацыйную падтрымку данаму працэсу, найбольш актыўна да тэмы пчалярства звярталiся “Полацкія епархiяльныя ведамасцi”. Так, у № 32 за 1916 г. былі надрукаваны наступныя матэрыялы: “Пчалярства ў старажытнай Русі”, “Знаёмства з пчоламі ў рамачных вуллях пад час агляду іх у памяшканні” і “Пчолы як авангард земляроба” [16, с. 462–468]. Апошні матэрыял быў перадрукаваны з “Томскіх епархіяльных ведамасцей”, тут адзначалася роля пчаляроў у засваенні лясных прастораў Сібіры (будаванне заімак, пракладка дарог і інш.). Грунтоўным артыкулам, прысвечаным пчалярству, адзначыўся святар Невельскага сабора У. Нікіфароўскі (“Полоцкие епархиальные ведомости”, №№ 43, 45, 46 1916 г.). Сам У. Нікіфароўскі меў шматгадовы досвед пчалярскай дзейнасці ў Віцебскай і Табольскай губернях. Заклікаючы мясцовых святароў да арганізацыі пчальнікоў, аўтар адзначае, што пчалярства не займае шмат часу і не патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі, а на асноўную праблему – укусы пчол – з часам, у пераважвай большасці выпадкаў, выпрацоўваецца імунітэт. Калі няма магчымасці спецыяльна высаджваць меданосныя культуры, то можна абыйсціся і пустазеллем (свірэпка, асот, валошкі). Прысутнічае тут і агляд літаратуры для пачынаючых пчаляроў (Л.–Л. Лангстрот “Пчала і вулей” (1853 г.), Э. Бертран “Дагляд за пчальніком. Каляндар пчаляра”(1914 г. – пераклад на рускую мову Р. Кандрацьева)).

Аднак ці атрымалася рэалізаваць праграму развіцця пчалярства на практыцы? “Мінскія епархіяльныя ведамасці” паведамляюць аб адной школе, дзе пачаў сістэматычна выкладацца курс пчалярства. Гэта Бабчынская жаночая школа (суч. – вёска Бабчына Хойніцкага раёна, знаходзіцца ў зоне адсялення, з 2008 г. выдалена з рэестра населеных пунктаў). Летам 1916 г. настаўніца Я. Бразінская прайшла пчалярскія курсы пры Багаслоўскай школе Тульскай губерні і атрымала дазвол на выкладанне курса. Школе было выдаткавана 300 руб. на арганізацыю пчальніка, а дапамогу ёй у гэтым павінны быў аказаць мясцовы земскі склад [17, с. 64]. Астатнія выданні (“Полацкія…” і “Магілёўскія…”) аб падобных выпадках не паведамляюць, аднак, магчыма, інфармацыю аб іх утрымліваюць іншыя крыніцы.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Праект праваслаўнай царквы па развіццю пчалярства і пчалярскай асветы быў накіраваны на пераадоленне “свячнога голада”: забяспечыць епархіяльныя свячныя заводы воскам. Праект меў важнае фінансавае значэнне, бо продаж свечак з’яўляўся асноўнай крыніцай прыбытку цэркваў. Для рэалізацыі гэтага праекта прапагандавалася ідэя стварэння прыхадскіх і епархіяльных пчальнікоў, быў распрацаваны вучэбны курс для царкоўна-настаўніцкіх і царкоўна-прыхадскіх школ, падрыхтоўчыя курсы для настаўнікаў. Пры гэтым умовы для рэалізацыі праекта былі зусім неспрыяльныя: баявыя дзеянні і ўсталяванне фронта на тэрыторыі Беларусі, значныя фінансавыя выдаткі, неабходнасць падрыхтоўкі кадраў і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. Па сукупнасці як аб’ектыўных, так і суб’ектыўных фактараў дасягнуць заяўленай мэты не атрымалася.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Уткин, И. Н. (Игумен Виталий). Борьба за свечную монополию и её церковно-политические последствия в истории Русской Церкви 1721–1917 гг. / И. Н. Уткин // Сборник трудов Якутской духовной семинарии. – 2021. – № 13–14. – С. 63–79. https://doi.org/10.24412/2686-9497-2021-13-14-63-79
2. Обучение пчеловодству в церковно-приходской школе : [объявление о подписке на журн.] // Минские епархиальные ведомости. – 1915. – № 4. – С. 17.
3. Отчет об оборотах сумм и материалов, а также о состоянии кредитов по Гродненскому Епархиальному церковно-свечному заводу и складу за 1913 г. // Гродненские епархиальные ведомости. – 1914. – № 44/45. – С. 421–450.
4. От Правления Витебского Епархиального свечного завода // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1916. – № 29. – С. 340.
5. Указ Его Императорского Величества Самодержца Всероссийского, из Святейшего Правительствующего Синода // Могилевские епархиальные ведомости. – 1915. – № 17. – С. 250–252.
6. Берегите пчелу, собирайте воск // Могилевские епархиальные ведомости. – 1916. – № 2. – С. 25–30.
7. Церковная пасека // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1916. – № 29. – С. 413–419.
8. Отчет о состоянии церковных школ Гродненской епархии за 1913/14 учебный год // Гродненские епархиальные ведомости. – 1915. – № 1–2. – С. 10–71.
9. Отчет Полоцкого Епархиального Наблюдателя о состоянии церковных школ Полоцкой епархии в 1912–1913 учебном году // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1914. – № 19. – С. 33–40.
10. Отчет Полоцкого Епархиального Наблюдателя о состоянии церковных школ Полоцкой епархии в 1912–1913 учебном году // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1914. – № 27. – С. 84–90.
11. Церковно-приходские школы Могилевской епархии в 1912–1913 учебном году // Могилевские епархиальные ведомости. – 1914. – № 20. – С. 566–574.
12. Правила преподавания пчеловодства в церковно-учительских школах // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1916. – № 22. – С. 257–259.
13. Правила преподавания пчеловодства в церковно-приходских школах // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1916. – № 24. – С. 286–288.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

14. Правила преподавания пчеловодства в церковно-приходских школах // Минские епархиальные ведомости. – 1916. – № 7. – С. 54–74.
15. Ульи механической работы системы Дадана-Блата и других : [реклам. объявление] // Могилевские епархиальные ведомости. – 1917. – № 1. – С. 17.
16. Из пчеловодной литературы // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1916. – № 32. – С. 462–468.
17. Преподавание пчеловодства в Бабчинской женской второклассной школе // Минские епархиальные ведомости. – 1917. – № 4. – С. 64.

References:

1. Utkin I. N. (Higumen Vitalii). The struggle for the candle monopoly and its church-political consequences in the history of the Russian Church 1721–1917. *Sbornik trudov Yakutskoi dukhovnoi seminarii = Collection of Research Papers of the Yakutsk Theological Seminary*, 2021, iss. 13–14, pp. 63–79 (in Russian). https://doi.org/10.24412/2686-9497-2021-13-14-63-79
2. 2 Teaching beekeeping in the parish school. *Minskie eparkhial'nye vedomosti* [Minsk Diocesan News], 1915, no. 4, p. 17 (in Russian).
3. Report on the turnover of sums and materials, as well as on the state of credits at the Grodno Diocesan Church Candle Factory and Warehouse for 1913. *Grodnenskie eparkhial'nye vedomosti* [Grodno Diocesan News], 1914, no. 44–45, pp. 421–450 (in Russian).
4. From the Board of the Vitebsk Diocesan Candle Factory. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1916, no. 29, p. 340 (in Russian).
5. Decree of His Imperial Majesty the Autocrat of All the Russias, from the Most Holy Governing Synod. *Mogilevskie eparkhial'nye vedomosti* [Mogilev Diocesan News], 1915, no. 17, pp. 250–252 (in Russian).
6. Take care of the bee, collect wax. *Mogilevskie eparkhial'nye vedomosti* [Mogilev Diocesan News], 1916, no. 2, pp. 25–30 (in Russian).
7. Church apiary. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1916, no. 29, pp. 413–419 (in Russian).
8. Report on the state of church schools of the Grodno diocese for the 1913/14 academic year. *Grodnenskie eparkhial'nye vedomosti* [Grodno Diocesan News], 1915, no. 1–2, pp. 10–71 (in Russian).
9. Report of the Polotsk Diocesan Observer on the state of church schools of the Polotsk diocese in the 1912–1913 academic year. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1914, no. 19, pp. 33–40 (in Russian).
10. Report of the Polotsk Diocesan Observer on the state of church schools of the Polotsk diocese in the 1912–1913 academic year. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1914, no. 27, pp. 84–90 (in Russian).
11. Church-parish schools of the Mogilev diocese in the 1912–1913 academic year. *Mogilevskie eparkhial'nye vedomosti* [Mogilev Diocesan News], 1914, no. 20, pp. 566–574 (in Russian).
12. Rules for teaching beekeeping in parish schools. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1916, no. 22, pp. 257–259 (in Russian).
13. Rules for teaching beekeeping in parish schools. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1916, no. 24, pp. 286–288 (in Russian).
14. Rules for teaching beekeeping in parish schools. *Minskie eparkhial'nye vedomosti* [Minsk Diocesan News], 1916, no. 7, pp. 54–74 (in Russian).
15. Hives of mechanical work of the Dadant-Blatt system and others. *Mogilevskie eparkhial'nye vedomosti* [Mogilev Diocesan News], 1917, no. 1, p. 17 (in Russian).
16. From beekeeping literature. *Polotskie eparkhial'nye vedomosti* [Polotsk Diocesan News], 1916, no. 32, pp. 462–468 (in Russian).
17. Teaching beekeeping at the Babchinsky girls' second-grade school. *Minskie eparkhial'nye vedomosti* [Minsk Diocesan News], 1917, no. 4, p. 64 (in Russian).

Дата паступлення артыкула 18.06.2025
Received 18.06.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 664.71:332.28:352.075.2(476)
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097943

Я. І. Мікула

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Мінск, Беларусь

МЛЫНОВАЯ СПРАВА І ВЫКАНКАМЫ Ў СЯРЭДЗІНЕ І 2-ОЙ ПАЛОВЕ 20-Х ГГ. XX СТ. У БССР

Анатацыя: Аўтарам разглядаецца невывучаная ў беларускай гісторыяграфіі праблематыка ўзаемадзеяння млыновых структур і выканкамамаў у БССР у сяэдзіне і 2-ой палове 20-х гадоў XX стагоддзя.

Ключавыя словы: млын, Наркамат харчавання БССР, млыновая справа, выканкамы, умоўнае валоданне, арэнда, зарплата.

Для цытавання. Мікула, Я. І. Млыновая справа і выканкамы ў сярэдзіне і 2-ой палове 20-х гг. XX ст. у БССР / Я. І. Мікула // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 36–47.

Е. И. Микула

Белорусский государственный музей народной архитектуры и быта, Минск, Беларусь

МЕЛЬНИЧНОЕ ДЕЛО И ИСПОЛКОМЫ В СЕРЕДИНЕ И 2-ОЙ ПОЛОВИНЕ 20-Х ГГ. XX В. В БССР

Аннотация. Автор рассматривает неизученную в белорусской историографии проблему взаимодействия мельничных структур и исполнительных комитетов в БССР в начале и второй половине 20-х годов XX века.

Ключавыя словы: мельница, Наркомат продовольствия БССР, мельничные дела, исполкомы, условная собственность, аренда, зарплата.

Eugene I. Mikula

The Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle, Minsk, Belarus

MILLING BUSINESS AND EXECUTIVE COMMITTEES IN THEM MIDDLE AND SECOND HALF OF THE 1920S IN THE BSSR

Abstract. The author considers the issue of interaction between mill structures and executive committees in the BSSR in the middle and second half of the 1920s, which has not been studied in Belarusian historiography.

Keywords: mill, People's Commissariat of Food of the BSSR, milling business, executive committees, contingent property, rents, wages.

For citation. Mikula E. I. Milling business and executive committees in them middle and second half of the 1920s in the BSSR. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 36–47 (in Belarusian).

У 1-ай палове 20-х гадоў XX ст. у БССР сфармавалася шматлікая сетка паравых, нафтавых, газа-генератарных, вадзяных, ветраных і

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

іншых млыноў. Большасць іх была пабудавана яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, але пэўная частка ўзнікла на беларускіх землях пад уздзеяннем нэпа. Пры гэтым уласнікамі прадпрыемстваў лічыліся як прыватнікі, так і т. зв. “умоўныя” ўладары, а таксама і арганізацыі ў выглядзе НКЗБ (Наркамату земляробства БССР – Аўт.), ці НКХБ (Наркамату харчавання БССР – Аўт.).

11 лютага 1924 г. на паседжанні СНК (Савет Народных Камісараў – Аўт.) БССР была прынята пастанова аб ліквідацыі НКХБ, якую прапанавалася правесці да 15 сакавіка 1924 г. Гэтаму папярэднічалі аналагічныя рашэнні на ўсесаюзным узроўні і практычныя мерапрыемствы па ператварэнні іх у жыццё ўнутры рэспублікі. 22 сакавіка 1923 г. прайшло паседжанне ЭКАНА БССР (Эканамічнай Нарады –Аўт.), дзе было вырашана: «Млыны з НКХ перадаць у валоданне мясцовых павятовых выканкамаў для ўзмацнення мясцовага бюджэта» [1, арк.2]. На працягу 1924–1926 гг. праходзіла паступовая перадача млыноў у рукі выканкамаў і акамуляванне сродкаў ад іх у мясцовыя бюджэты. Тым не менш колькасць працуючых млыноў змянілася няшмат, таму што галоўнай сваёй мэтай выканкамы лічылі захаванне статус-кво, здзяйсняючы перш за ўсё перадачу перайшоўшых да іх млыноў у арэнду. Таксама за гэты перыяд часу выканкамы (сумесна з статыстычнымі органамі) змаглі наладзіць улік большасці млыноў, уключаючы ў свае статыстычныя спісы перш за ўсё ветракі, якія не ўлічылі органы Савецкай улады адразу пасля грамадзянскай вайны.

Адным з вынікаў расфарміравання НКХБ было зачыненне яго структурнага падраздзялення – млыновага аддзела Наркамата харчавання. Адносна распрацаваная сістэма мерапрыемстваў па функцыянаванні млыновай справы ў БССР, статыстычныя напрацоўкі, сувязі на месцах, створаныя і ажыццяўлёныя НКХБ, адышлі ў нябыт. Уладарам і супрацоўнікам млыновых структураў прыходзілася нанава наладжваць справаводныя ўзаемаадносіны ўжо з прадстаўнікамі мясцовых выканкамаў, якія мелі свае ўласныя інтарэсы і з’яўляліся па сутнасці новымі гаспадарамі млыноў.

23 лістапада 1923 г., г.зн. раней да вышэйпазначанай даты перахода млыноў у рукі новых кіраўнікоў, млыновы аддзел НКХБ перадаў найлепшыя паравыя млыны г. Слуцка («Прагрэс», «Эканомія», «Усход») Слуцкаму павятоваму выканкаму. Камісія па перадачы млыноў 25 чэрвеня 1923 г. канстатавала: «Фактычнай

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

перадачы падлягаюць толькі паравыя і вадзяныя млыны, як безгаспадарчыя, так і ва ўмоўным валоданні. Што ж датычыцца ветракоў і конскіх млыноў, то перадачу іх праводзіць на падставе дакументальных дадзеных, якія маюцца ў павятовым харчкаме». Саўгасныя і калгасныя млыны заставаліся по-ранейшаму ў валоданні НКЗБ [2, арк.12, 153, 254].

У сваёй справаздачы за 1925/1926 г. Слуцкі акруговы камітэт канстатаваў: «У акрузе маецца больш за 50 млыноў, прычым галоўныя з іх (вальцавыя) знаходзяцца ў Слуцку. Млыновая прамысловасць у акрузе дужа развітая. Толькі ў Старобінскім раёне 13 паравых і адзін вадзяны млын». Найбольш мацнейшыя (чырвона-слабадскі і кучанскі) млыны знаходзіліся ў непасрэднай эксплуатацыі райвыканкамаў, астатнія ў выніку іх слабасці і адсутнасці сродкаў райвыканкамы здалі ў арэнду па дагаварам, у большасці за рамонт альбо нязначную арэндную плату [3, арк.17, 21]. Падобную інфармацыю на пленуме акрплана (планавая камісія акругі – Аўт.) Барысаўскай акругі агучыў кіраўнік Полацкай акруговай інспекцыі Пісарык: «З усіх маючыхся (у Барысаўскай акрузе) відаў мясцовай прамысловасці, млыновая справа займае першае месца (па сумме падатку, колькасці працоўных). 65% агульнага ліку прадпрыемстваў знаходзіцца ў прыватных руках. З 35% шмат знаходзіцца ў прыватных асобаў на дагаварных пачатках… Па 6 раёнам акругі з 95 млыноў (62 прыватныя) аддаць РВК (раённы выканаўчы камітэт – Аўт.) 9… Гэтыя прадпрыемствы цалкам рэнтабельныя, добра абсталяваныя і безумоўна падлягаюць перадачы РВК». У Зэмбінскім раёне з 20 млыноў 10 былі перададзены РВК, прычым добра абсталяваны млын Дворкіных (два паліўных кола – 80% прыдатнасці, камяні ў паставе – 100%) вызваў цікавасць выканкама, у той час як лядашты млын Ёселя Левіна, на які не мелася нават дакументаў, РВК палічыў магчымым заставіць Левіну [4, арк.18].

У 1926 г. у Барысаўскай акрузе мелася 95 млыноў (з іх 10 – паравыя, 2 – нафтавыя, 19 – турбінныя, 31 – вадзяныя; пры гэтым 33 млыны належалі юрыдычным асобам). Сумма падаткаў з прыватных млыноў склала 10214 рублёў, а ад астатніх – 3050 рублёў (30% ад агульнай сумы падаткаў). На млынах Барысаўскай акругі працавалі 194 рабочыя. Не вельмі адрознівалася сітуацыя і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Толькі 7 прыватных вадзяных млыноў 3-й катэгорыі

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Ушачскага раёна Полацкай акругі за 1925 г. далі дзяржаве чыстага прыбытку 33760 рублёў [4, арк.9].

Апынуўшыся каля эканамічнага стырна ўлады, выканкамы хуценька сталі заключаць дагавары з арандатарамі ў першую чаргу на дастаткова працяглыя тэрміны, імкнуўшыся як мага хутчэй дамагчыся выгадных для сабе вынікаў, атрымаць рэальныя дывідэнты і кантраляваць фінансавыя струмені. Так, Уздзенскі РВК у 1925 г. заключыў арэндны дагавор на чатыры гады (з 1 кастрычніка 1925 г. па 1 красавіка 1929 г.) з Сролем Шмуйлавічам Дукорам на здачу вадзянога турбіннага млына, пабудаванага яшчэ ў 1877 г. на рацэ Усе ў в. Астравок Сямёнаўскага сельсавета Уздзенскага раёна, за 890 рублёў у год на працягу чатырох гадоў з канчатковай выплатай 3000 рублёў і з правядзеннем капітальнага рамонта прадпрыемства. На млыне звычайна працавалі чатыры-пяць чалавек, мелася вадзяная турбіна «Фрэнсіс» *(Малюнак 1),* агульны кошт пабудоў і абсталявання складаў больш 7000 рублёў [5, арк.18].



Малюнак 1 – Схема млына і турбіны сістэмы Френсіса ў Цеханавецкім музеі. Рэспубліка Польшча, 2019 г.

Той жа Уздзенскі РВК здаў вадзяны колавы млын на р. Кумелька на хутары Баравінка Слабодска-Пырашэўскага сельсавета Уздзенскага раёна на 5 гадоў (з 14 кастрычніка 1926 г. па 14 кастрычніка 1931 г.) Стэфану Феафілавічу Паўловічу ўсяго за 200

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

рублёў, але з умовай здзяйснення поўнавартаснага рамонта. Кошт пабудоў і абсталявання складаў трохі больш за 300 рублёў [5, арк.36]. Дагавор арэнды вадзянога млына на р. Дварэц пры хутары Дварэц Стальбоўскага сельсавета Уздзенского раёна з Пацэйковічам Канстанцінам Антонавічам прадугледжваў выплату 750 рублёў за пяць гадоў (з 21 жніўня 1926 г. па 21 жніўня 1931 г.) пры правядзенні капітальнага рамонта ў выглядзе перакладкі млына з пераборкай гнілога матэрыяла з сценак, устаноўкай новага даха з гонта, устаўленнем новых палёў і пабудовай новага маста замест збуранага, а таксама наліўкай двух паставоў [5, арк.74]. У гэтым выпадку выканкаму па дагавору было цікавей атрымаць не толькі грошы, колькі палепшыць эканамічны стан прадпрыемства пад арэнду ў наступныя гады.

Лагойскі РВК 2 верасня 1925 г. заключыў умову з чатырма кампаньёнамі – Шлёмай Ёселевічам Грынштэйнам, Мордухам Цымановічам Шымановічам, Лейбай Шаламавічам Бланкам і Якавам Хаімавічам Выгонічам – на чатыры гады на арэнду вадзянога млына і электрастанцыі ў г. Лагойску за 14000 пудоў зерня ў год. Эксплуатацыя вадзянога млына ў гэтым «дуэце» прадпрыемстваў для арандатараў была галоўным стымулам, паколькі на млыне функцыянавалі два паставы, дынама-машына і меўся драўляны будынак (20х14 аршынаў). Дагавор патрабаваў здзяйсняць утрыманне ўсіх мастоў у спраўнасці, правесці капітальны рамонт турбіны, замяніць трансмісіённы вал [6, арк.37, 40]. Такія абавязкі былі цалкам разумнымі, бо прарывы дамбаў і зруйнаванні мастоў чынілі значныя гаспадарчыя шкоды таму ці іншаму рэгіёну, не кажучы ўжо пра навакольныя сялянскія гаспадаркі.

Койданаўскі РВК здаў вадзяны колавы млын у в. Малыя Новасёлкі селяніну в. Ляхавічы Уладзіміру Міхайлавічу Вашыну з двума паставамі і крупадзёркай на 6 гадоў з 15 красавіка 1926 г. па 15 красавіка 1932 г. з арэндай на тры гады бесплатна, а астатнія тры гады па 400 рублёў у год арэнды з вялікім цякучым рамонтам [7, арк.11].

Лагойскі РВК умудрыўся заключыць дагавор нават на 8 гадоў на пабудову вадзянога млына на кавалачку зямлі ў 3,27 га з яго бясплатнай перадачай арандатару Івану Сямёнавічу Зяленке ў былым маёнтку Бабры Калачоўскага сельсавета Лагойскага раёна з

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

10 лютага 1926 г. да 10 лютага 1934 г. Па дагавору меркавалася ўстаноўка за кошт арандатара двух мукамольных паставоў, крупадзёркі і пытлёўкі, турбіны магутнасцю 25 к.м., выраб новай верхняй часткі маста [6, арк.42]. Таксама на 8 гадоў (1926–1934 гг.) быў зданы вадзяны млын з двума паставамі і крупадзёркай на р. Уса пры в. Чарнікаўшчына Койданаўскім РВК жыхару Мінска Мітрафану Мікалаевічу Бабічаву. Першы год арэнды быў бясплатны, за другі трэба была заплаціць 200 рублёў, трэці – 300 рублёў, астатнія 5 гадоў – па 700 рублёў у год з выкананнем бягучага рамонта [7, арк.15].

Не грэбавалі выканкамы і нязначнымі па памерах арэнднымі плацяжамі. Барысаўскі РВК 6 мая 1924 г. здаў у арэнду на тры гады (з 9 лютага 1924 г. па 8 лютага 1927 г.) вадзяны колавы млын з адным паставом на хутары Чырвоны Бор Гайна-Слабадской воласці Барысаўскага павета Макарыю Андрэевічу Сяргееву. Выплаты па гадах былі размеркаваны адпаведна: 38 рублёў, 65 рублёў і яшчэ раз 65 рублёў. Абавязкі арандатара ўключалі бягучы рамонт, страхоўку і абавязковую здачу да канца арэнднага тэрміна спраўнага і адрамантаванага млына [6, арк.50]. Лагойскі РВК 25 верасня 1925 г. заключыў дагавор на арэнду вадзянога млына на тры гады ў в. Калачыха Калачоўскага сельсавета Лагойскага раёна з Сцяпанам Гаўрылавічам Куксай з абавязкам выплаты арандатарам за тры гады 325 рублёў. Млын меў адзін пастаў, крупарушку, драўляны будынак (10х10 аршынаў), жылое памяшканне для млынара, сарай з адной дзесяцінай сенакоса. Абавязковымі ўмовамі для арандатара былі выкананне трох новых вокнаў, наліўка жорнаў у паставе, насціланне ніжняга маста, выраб новай бартніцы, пабудова новай хаты для млынара *(Малюнак 2)* і выкананне двух новых вадзяных колаў і зубчастага кола ўнутранага механізма [6, арк.54].

Арандатар Конахаўскага вадзянога колавага млына з в. Конахаўка Клімовічскага раёна Калінінскай акругі Савелій Емельянавіч Міхееў заключыў 29 студзеня 1925 г. з Клімовічскім выканкамам дагавор на пяць гадоў на 1800 рублеў арэнднай платы з разбіўкай па гадах па 360 рублеў на кожны год. Арандатар быў згодны на вялікую колькасць рамонтных прац, у тым ліку забіванне новых палёў пад сцены будынка, замену аснавання пад вадзяную помпу, выраб пяці новых вокнаў, перабудову даха. Нават вялікая арэнда з шматлікімі рамонтнымі працамі не палохалі арандатара,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

адчуваў ён сябе дастаткова ўпэўнена. Цікава, што з 13 арандатараў, справы якіх удалося прааналізаваць па Калінінскай акрузе, Крычаўскаму і Клімавіцкаму раёнам, 7 асобаў аплочвалі падобную альбо вышэйшую арэнду мясцовым выканкамам з разліку на пяць гадоў з правядзеннем рамонтных прац і выплатай страхоўкі [8, арк.9–10, 5–38].



Малюнак 2 – Хата млынара разам з гасцявым домам у Заслаўі пры паравым млыне. 2024 г.

Рамонт гідратэхнічных канструкцый у дастасаванні да вадзяных млыноў прагаворваўся ў большасці дагавораў з арандатарамі. Калісьці ў старадаўнія славянскія часы, каб пазбегнуць наступстваў павадкаў, млынары прыносілі нячыстай сіле ў выглядзе вадзяніка альбо каго-небудзь яшчэ прынашэнні, якія кідалі ў ваду («сцягнюк свіны», ахвярныя парсючкі, кавалак мяса і г. д.) [9, с.30–31]. У 20-я гады павадкі не зніклі, нягледзячы на былыя прынашэнні, таму ў дагаварах абавязкова існавалі пункты аб рамонце мастоў альбо дамбаў. Што гэты пункт – не галаслоўнае сцвярджэнне, ілюструе наступны факт. Перад намі апісанне значнай па мясцовым сялянскім

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

меркам, а ў пераносным сэнсе, можна казаць, «біблейскай» аварыі, датаванай 13 мая 1930 г. на млыне «Гарбаты Мост» Плешчаніцкага раёна: «Сего числа в 2 часа дня во время работы… мельником т. Ярошем Гр. (Григорием Ильичем – Аўт.) совместно с помольщиками был услышан треск и вслед за этим замечена была нахлынувшая вода в нижнем этаже мельницы, где в то время просеивалась крупа помольщиков. Вслед за этим мельник выбежал на мост и обнаружил, что посреди моста образовался прорыв и вода полным напором со стороны озера свободно двигалась совместно с отмелом в прорвавшую часть моста… При осмотре на месте оказалось, что прорыв произошел посреди моста длиной в 5,5 м с вынесением части шпунтового ряда свай, повреждением короля и шлюза и вследствие подмыва крупных свай нарушено все состояние става, – в итоге чего разрушена проездная часть моста. Под нижней частью моста…приблизительно 3–4 м от внезапного и сильного падения напорной воды – образовалась яма глубиной в 5 м, что и способствовало к подмыву крупных свай» [10, арк.13,14].

Працягваўся працэс будаўніцтва млыноў прыватнымі асобамі, у тым ліку і ў другой палове 20-х гадоў. 27 верасня 1927 г. атрымаў дазвол на запуск пабудаванага млына ў в. Снусцік Пухавічскага раёна млынар Элья Шапіра. У той жа час атрымаў дазвол на пабудову ветрака ў в. Выгода Смалевічскага раёна Віктар Граковіч. 22 лістапада 1927 г. атрымалі дазвол на пуск паравога млына ў в. Захарычы Заслаўскага РВК Язэп Хілько, Міхась Міна і Янка Драздоўскі [11, арк.181, 187, 230].

Ацэньваючы дзейнасць выканкамаў у млыновай справе, трэба адзначыць і першыя выпадкі выцiскання ўладнымі структурамі млыноў з прыватнага валодання ва «умоўнае», ці з «умоўнага» у дзяржаўнае. 15 снежня 1926 г. быў выняты на карысць мясцовага РВК з «умоўнага» уладарання Ё. Тыркельмана вадзяны турбінны млын «Азарышчына» Самахвалавічскага раёна на падставе пастановы ЭКАНА рэспублікі. Паколькі млын лічыўся «добрым» (мелася турбіна 35 к.м., два паставы, піцель і крупадзерка-аўтамат), але ўсё роўна ён патрабаваў рамонта, то раённыя ўлады прасілі ад Менскага акруговага камітэта, каб ім дазволілі «выдаткаваць 2500 рублёў з амартазацыйнага фонда на капітальны рамонт млына». У сваю чаргу РВК абавязваўся вярнуць гэтую суму за тры гады [12, арк. 32–33].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Тыповым у гэтых адносінах быў выпадак з вадзяным млыном на хутары Дзвінячы Траскоўскага сельсавета Заслаўскага раёна на рацэ Іслач. Да рэвалюцыі млын належаў вядомаму ў акрузе абшарніку Станіславу Раве. У 1918 г. млын быў спалены «советскими войсками», а пазней адноўлены высілкамі млынара Хаіма Мардуховіча Гур'яна. Вось як ён апісваў падзеі сярэдзіны 20-х гадоў: «В 1924 г. заведующий подотделом Минского комхоза т. Белкинд вызвал меня в Минск и потребовал, чтобы я заключил с коммунхозом арендный договор на свою мельницу. Я долго отказывался от этого, так как мельница…исключительно моя, а не помещичья (млын быў спалены ў 1917 г., г. зн. Гур'ян будаваў яго ўжо самастойна, без удзелу абшарніка – Аўт.) и заключать с комхозом арендный договор на нее не было никакой надобности. Тогда Белкинд прибег к угрозе немедленно отнять у меня мельницу и поставил мою мельницу на торги. Боясь потерять мельницу, я вынужден был участвовать в торгах, а затем даже просить комхоз оставить мельницу за мной, так как по своей бедности я предложил меньшую арендную плату, чем мой конкурент. Комхоз удовлетворил мою просьбу и заключил со мной договор. Однако у нотариуса этот договор не был засвидетельствован. Второго экземпляра этого договора Белкинд мне просто не выдал. Знаю только, что договор был заключен на три года, а арендная плата составляла 500 рублей в год. В том же году мельница из комхоза перешла в ведение Заславского РИКа…

Дело (па млыну – Аўт.) находится в производстве гражданского отделения Минского окрсуда, к которому я обращался с просьбой о признании за мной права собственности на мельницу. Суд однако отказал мне в этом, так как нашел, что мою мельницу надлежит считать национализированной…» [13, арк.252,349]. Гэты прыклад – адна з «першых ластавак» будучых выняткаў прыватнай уласнасці, якія разгарнуліся ў канцы 20-х гадоў, але гэты выпадак характэрны сваёй будзённасцю, нахабнасцю кіраўніка ўладнай структуры і пагардай да правоў уласніка.

Персанал млыноў, якія належалі РВК, адносна нармалёва зарабляў па тым часам: заробкі млынароў, напрыклад, ва Уздзенскім раёне ў 1926/1927 гаспадарчым годзе былі вышэй, чым у шаўцоў, кавалёў, шапачнікаў, краўцоў, гарбароў, сталяроў, бляхароў, рамізнікаў, складаючы ў сярэднім 40–50 рублёў [5, арк.53]. У якасці

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

нагляднага прыклада можна прывесці зарплаты на лесапільным і мукамольным заводзе ва ўрочышчы Закрэўшчына Зенкоўскага сельсавета Уздзенскага раёна ў 1926/1927 г. Млын належаў мясцоваму РВК, загадчыкам якога з'яўляўся Іван Іпалітавіч Жук. На прадпрыемстве, заснаваным у 1907 г., стала працавала пяць чалавек, а з улікам падзённых рабочых – 9 чалавек. Зарплата загадчыка складала 58,80 рублёў, млынара – 49,50 рублёў, машыніста – 58,80 рублёў, цыркуляршчыка – 35 рублёў, вартаўніка – 30,80 рублёў, а вучня – 14 рублёў [5, арк.1]. На вадзяным турбінным млыне ў в. Астравок Сямёнаўскага сельсавета Уздзенскага раёна пры кіраўніцтве арандатара С.Ш. Дукоры стабільна працавала чатыры-пяць чалавек. Зарплата супрацоўнікаў млына хісталася ад 32 да 55 рублёў (найбольшы памер зарплаты быў у млынара). Пры гэтым рабочыя таксама не былі жабракамі, маючы ў сваіх асабістых гаспадарках па тры дзесяціны зямлі, па дзве каровы і па адным кані [5, арк.18]. Для параўнання: зарплата настаўніцы Берасцейскай школы Мінскага раёна Адамовіч Зінаіды Іванаўны ў студзені 1929 г. складала 44 рублі [14, арк.16].

Цікава, што зарплаты персанала прыватных млыноў не вельмі адрозніваліся ад выканкамаўскіх млыноў. У якасці прыкладу прыведзем паказчыкі працы нафтавага млына і крупадзёркі ў мястэчку Узда, заснаванага ў 1923 г. пяццю кампаньёнамі – Мовшай Шмуйлавічам Рэзнікам, Аронам Ефімавічам Ліўшыцам, Мендзелем Ёселевічам Мінкавым, Барысам Нахімавічам Кайзаровічам і Рувінам Ісакавічам Беранштэйнам. На млыне працавалі дзве асобы (машыніст з зарплатай 63 рублі і млынар з зарплатай 52,5 рубля). Ім дапамагаў вучань з зарплатай 15 рублёў. Усе работнікі працавалі ў адну змену. На млыне з нафтавым рухавіком фірмы «Петэрс» у 25 к.м. функцыянаваў адзін пастаў з крупадзёркай. Канкурэнцыю прадпрыемству ў м. Узда складала крупарушка з конскім прывадам па выдзелцы грэчкавай крупы, якая належала Шлёме Гіршэвічу Аўскеру, таксама заснаваная ў 1923 г. [5, арк.88,91].

Ускосным доказам карпатлівай, штодзённай працы млыноў з'яўляюцца акты іх абследаванняў, дзе паказвалася колькасць наёмных працаўнікоў, інтэнсіўнасць працы млыноў і г.д. Напрыклад, млынар, машыніст, цыркуляршчык, вартаўнік і два служачых інтэнсіўна працавалі па дзве смены на паравым млыне з цыркуляркай ва ўрочышчы Балачанка Балачанскага сельсавета

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Пухавічскага раёна. Млын быў зданы тром кампаньёнам (Ісаак Зубараў, Карп Ісін, Рыгор Абрамавіч Ліўшыц) мясцовым РВК на тры гады з 24 чэрвеня 1925 г. Вынікі праверкі дзейнасці прадпрыемства канстатаваліся наступным чынам: «Кіруюць самі арандатары», что больш-менш з пункту погляду праверaючых сведчыць аб якасці іх працы [15, арк.5].

Гэткая занятасць наёмнага персанала на выканкамаўскіх млынах сведчыць аб інтэнсіўнай працы млыноў у сярэдзіне 20-х гадоў XX стагоддзя перш за ўсё ў сезонныя месяцы альбо на млынах, якія не зазнавалі сур'ёзнай канкурэнцыі (па-за куставым размяшчэнні ветракоў, па-за зонай кучкавання вадзяных млыноў у рэчных масівах альбо паравых млыноў у вялікіх населеных пунктах і г.д.).

Такім чынам, выканкамы разглядалі сваю працу з млынамі на доўгія тэрміны па часе. Арандатараў не палохалі ні часамі высокі кошт арэнды, ні іншыя плацяжы і рамонтныя працы, наадварот людзі, працуючыя на гэтым тыпе прадпрыемстваў, бачылі ў млыне сваю «уласную справу» на доўгі час. І такіх арандатараў было шмат. Што ж тычыцца ролі выканкамаў, то яны ўсведамлялі немагчымасць у сярэдзіне 20-х гадоў татальнага кантролю млыновай гаспадаркі асабістымі сіламі, не маючы магчымасці мадэрнізаваць млыны за свой кошт, і лічылі за лепшае абмяжоўвацца здачай млыноў, якія папалі ў іх валоданне, у арэнднае карыстанне з найбольшым эканамічным эфектам. Выканкамаўскія структуры кіраваліся ў сваёй дзейнасці прынцыпам «не замінай».

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 18. Воп. 1. Спр. 293.
2. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 1. Спр. 962.
3. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 558.
4. НАРБ. – Ф. 18. Воп. 1. Спр. 272.
5. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМінВ). – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 22.
6. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 19.
7. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 3.
8. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМагВ). – Ф. 348. Воп. 1. Спр. 1.
9. Ненадавец, А. М. Легенды старых млыноў / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – 278 с.
10. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 49.
11. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 27.
12. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 31.
13. НАРБ. – Ф. 18. Воп. 1. Спр. 292.
14. ДАМінВ. – Ф. 591. Воп. 1. Спр. 52.
15. ДАМінВ. – Ф. 150. Воп. 1. Спр. 21.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

References:

1. *The National Archives of the Republic of Belarus (NARB)*, coll. 18, aids 1, fol. 314. (in Belarusian).
2. *The National Archives of the Republic of Belarus*, coll. 48, aids 1, fol. 962. (in Belarusian).
3. *The National Archives of the Republic of Belarus*, coll. 6, aids 1, fol. 558. (in Belarusian).
4. *The National Archives of the Republic of Belarus*, coll. 18, aids 1, fol. 272. (in Belarusian).
5. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 22. (in Belarusian).
6. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 19. (in Belarusian).
7. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 3. (in Belarusian).
8. *The State Archives of Mogilev Region*, coll. 348, aids 1, fol. 1. (in Belarusian).
9. Nenadavets A. M. *Legends of old mills*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 278 p. (in Belarusian).
10. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 49. (in Belarusian).
11. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 27. (in Belarusian).
12. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 31. (in Belarusian).
13. *The National Archives of the Republic of Belarus*, coll. 18, aids 1, fol. 292. (in Belarusian).
14. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 591, aids 1, fol. 52. (in Belarusian).
15. *The State Archives of Minsk Region*, coll. 150, aids 1, fol. 21. (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 04.08.2025
Received 04.08.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 631.15 (476–15)«1921/1939»
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097953

В. П. Гарматны

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

СЯЛЯНСКАЕ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 ГГ.

Анатацыя. У 1921–1939 гг. найбольш заможная частка заходнебеларускага сялянства спрабавала адаптавацца да капіталістычных умоў праз выкарыстанне наёмнай працы і рознага роду сельскагаспадарчых машын. Разам з тым на такую карэнную рэарганізацыю гаспадарання неабходны былі ільготныя банкаўскія крэдыты, але польскі ўрад аказваў такую дапамогу выбарачна і недастаткова, таму нямногія сяляне Заходняй Беларусі змаглі ў выніку стаць сапраўднымі вясковымі прадпрымальнікамі.

Ключавыя слова: сельская гаспадарка, прадпрымальнікі, крэдыт, інвентар, ураджайнасць, наёмная праца.

Для цытавання. Гарматны, В. П. Сялянскае прадпрымальніцтва ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 48–57.

В. П. Гарматный

Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

КРЕСТЬЯНСКОЕ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВО В ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1921–1939 ГГ.

Аннотация. В 1921–1939 гг. наиболее зажиточная часть западнобелорусского крестьянства пыталась адаптироваться к капиталистическим условиям, используя наёмный труд и различного рода сельскохозяйственные машины. В то же время для столь радикальной реорганизации экономики необходимы были льготные банковские кредиты, но польское правительство оказывало такую помощь избирательно и в недостаточном объёме, поэтому лишь немногие крестьяне Западной Беларуси смогли в итоге стать настоящими сельскими предпринимателями.

Ключевые слова: сельское хозяйство, предприниматели, кредит, инвентарь, урожайность, наёмный труд.

Vitaliy P. Harmatny

The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

PEASANT ENTREPRENEURSHIP IN WESTERN BELARUS IN 1921–1939

Abstract. In 1921–1939, the most affluent part of the West Belarusian peasantry tried to adapt to capitalist conditions, using hired labour and various kinds of agricultural machinery. At the same time, preferential bank loans were necessary for such a radical reorganization of the economy, but the Polish government provided such assistance selectively and insufficiently, so few peasants of Western Belarus were able to become real rural entrepreneurs.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Keywords: agriculture, entrepreneurs, credit, inventory, productivity, hired labor.
For citation. Harmatny V. P. Peasant Entrepreneurship in Western Belarus in 1921–1939. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 48–57 (in Belarusian).

Па выніках Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г. Заходняя Беларусь увайшла ў склад тагачаснай Польшчы, абсалютную большасць мясцовага насельніцтва (больш 80 %) складалі сяляне, эканоміка рэгіёна ў многім насіла выразна аграрны характар, тут захоўвалася буйное памешчыцкае землеўладанне, а сяляне ў сваёй большасці былі малазямельнымі і беззямельнымі, востра пакутавалі ад зямельнага дэфіцыту, патрабавалі перш за ўсё дадатковага надзялення ворнай зямлёй і стварэння іншага роду ільготных умоў гаспадарання [1, s. 7]. Агульная агратэхнічная культура мясцовага сялянства ацэньвалася як невысокая: напрыклад, у заходнебеларускай вёсцы ў першую чаргу выкарыстоўваліся натуральныя гнаі, а мінеральныя ўгнаенні фактычна адсутнічалі, на той час як у заходніх ваяводствах іх выкарыстоўвалі істотна больш, што забяспечвала больш высокую ўраджайнасць [2, s. 21, 30].

Сітуацыю ўскладняў шырока распаўсюджаны натуральны разлік з сялянамі за выкананую працу, што было абумоўлена пасляваеннай разрухай. Напрыклад, на пачатак 1920-х гг. у Дзісненскім павеце Віленскага ваяводства працаўнік зарабляў за месяц работы ў сельскай гаспадарцы заможнага селяніна каля 7 пудоў жыта (112 кг, прыкладна 24,5 злотых у грашовым эквіваленце). Нярэдкімі былі расплаты за працу гарэлкай, што падрывала эканамічныя перспектывы вяскоўцаў [3, с. 95]. Калі ж у заходнебеларускага селяніна з’яўляліся грошы, то ён іх укладваў галоўным чынам у набыццё свойскай жывёлы ці дадатковага надзелу зямлі. Грашовыя затраты ішлі ў асноўным на выплату падаткаў, куплю прамысловых тавараў і аплату царкоўных абрадаў. У сувязі са складаным эканамічным становішчам тавар у крамах і на рынках сяляне часта на той час не куплялі, а выменьвалі на прадукты [4, s. 74].

Звесткі аб размеркаванні ворнай зямлі ў Заходняй Беларусі на верасень 1921 г. прыведзены ў табліцы 1 (у якасці заможных маюцца на ўвазе сяляне, якія мелі больш за 20 га) [5, с. 15].

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Табліца 1. – Размеркаванне ворнай зямлі ў Заходняй Беларусі на верасень 1921 г.

Гаспадаркі	Колькасць	%	Плошча зямлі, га	%	Сярэдні надзел, у га
Бядняцкія	284 706	80,15	1 290 115	24,15	4,53
Серадняцкія	49 426	13,91	667 577	12,50	13,51
Заможныя	15 107	4,25	434 696	8,14	28,77
Памешчыцкія	5 987	1,69	2 948 305	55,21	500
Усяго	**355 226**	**100,00**	**5 340 693**	**100,00**	

Пры аналізе прыведзеных у табліцы звестак, можна падкрэсліць, што да ліку прадпрымальніцкіх сялянскіх гаспадарак адносіліся эканамічна моцныя, цесна звязаныя з рынкам, здольныя забяспечваць гаспадарку ўладальніка ўсім неабходным дзякуючы продажу на рынак прадуктаў ці сыравіны. У такіх адзінках шырока выкарыстоўваліся найбольш перадавыя метады вядзення гаспадарання, наёмная праца, сельскагаспадарчыя машыны і штучныя ўгнаенні, назіралася спецыялізацыя на вырошчванні асобных відаў гародніны альбо жывёлы. У лік такіх гаспадарак без сумніву ўваходзілі заможныя (сельская буржуазія, мужыцкая арыстакратыя, фермеры ці згодна савецкай гістарыяграфіі кулакі) і прыблізна палова сераднякоў, іх найбольш багатая частка, што разам складала ўмоўна каля 10 % сялянства. Варта адзначыць, што савецкая гістарыяграфія ацэньвала такую катэгорыю сялянства рэзка адмоўна як апору польскіх уладаў і эксплуататараў на вёсцы, на той час як згодна сучасных навуковых падыходаў можна падкрэсліць, што дзякуючы існаванню гэтай катэгорыі сялянства ў найбольш бяднейшай яго частцы – батракоў – мелася магчымаць наймацца да іх на працу на пастаяннай ці часовай аснове, што ўяўляла для іх бадай адзіную крыніцу выжывання пры адсутнасці ўласнай гаспадаркі. У сувязі з гэтым неабходна больш грунтоўнае і ўсебаковае вывучэнне становішча дадзенай катэгорыі сялянства.

Сераднякі займалі прамежкавае становішча і па статыстычным дадзеным каля 25 % з іх пастаянна выкарыстоўвалі наёмную працу. Нават у крызісны 1931 г. з кожных 100 серадняцкіх гаспадарак плошчай ад 10 да 15 га дадатковых працаўнікоў наймалі ў Віленскім ваяводстве 14,6, у Навагрудскім – 14,5, Палескім – 6,2 [6, с. 46].

Дробныя гаспадаркі мелі невялікія надзелы зямлі. Недастатковыя для паўнацэннага функцыянавання, і вымушаны былі арандаваць дадатковую зямлю ў памешчыкаў і заможных

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сялян, наймацца да іх на працу. Жыццёвы цыкл такіх гаспадарак яскрава апісаны тагачаснікамі: “Пачынаецца цяжкая і пакутная праца яго (маладога селяніна). Праўда, спачатку была энэргія і пад’ём у стварэнні сваёй гаспадаркі, але, сутыкаючыся, на кожным шляху з недахопамі, пад’ём хутка знікае. У новага гаспадара няма патрэбнага лесу на будаўніцтва хаты і іншых пабудоў, няма на што набыць недастатковую жывёлу, няма інвентара (плуга, бараны). Час праходзіць за працай. Малады гаспадар, спачатку ўпэўнены ў самім сабе, потым губляе надзею на паляпшэнне свайго становішча, бо гаспадарка як была бядняцкай, так і засталася” [7, с. 46–47].

Пытанне ажыццяўлення аграрнай рэформы і перадачы значнай часткі памешчыцкіх зямель сялянам, асабліва гаспадаркам сямейнага тыпу, паўстала ў Польшчы прадметам гарачай дыскусіі яшчэ перад вяртаннем дзяржаўнай незалежнасці і ад яго вырашэння ў многім залежаў далейшы лёс краіны. Прадстаўнікі польскай эліты папярэджвалі аб небяспецы звядзення аграрнай рэформы “да простай перадачы зямлі ад аднаго класу іншаму, бо мэтай рэформы павінна стаць рэчаісная выправа ўсяго аграрнага ладу, выправа ўсебаковая і трывалая, разлічаная на далёкую будучыню і ствараючая падставы для нармальнага развіцця сельскай гаспадаркі” [8, s. 23].

Паводле артыкула 1 закону аб аграрнай рэформе ад 28 снежня 1925 г. аграрны лад у Польшчы павінен абапірацца на здаровыя вытворныя гаспадаркі, якія павінны былі весці сваю гаспадарку прынцыпова па-новаму і фактычна пераўтвараліся ў прадпрымальніцкія. У цэлым па меркаванню сучаснага польскага гісторыка А. Ліхаровіча, ажыццяўляемая ў міжваеннай Польшчы аграрная рэформа “была рацыянальнай спробай эвалюцыйнага ажыццяўлення аптымальнай – у рамках існуючых эканамічных магчымасцяў сельскай гаспадаркі і дзяржаўных фінансаў – карэктуры (выпраўлення) ладу і структуры тагачаснай… вёскі” [9, s. 92]. Згодна заканадаўства гэтая рэформа не была і не магла быць радыкальнай зменай тагачаснага аграрнага ладу, бо з’яўлялася рэформай, а не рэвалюцыяй. Як слушна падкрэсліваюць даследчыкі, нават калі б яе не перарвала Другая сусветная вайна, усіх існуючых зямельных запасаў не хапіла б на ўсіх сялян, патрабуючых дадатковага надзялення зямлёй. У сувязі з гэтым патрабавалася

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

мадэрнізацыя аграрных адносін, агульная паўсюдная інтэнсіфікацыя і рацыяналізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці [10, s. 131].

Тагачасныя польскія эканамісты падкрэслівалі, што для вядзення паўнацэннай асабістай сельскай гаспадаркі і выплаты працэнтаў па ўзятаму банкаўскаму крэдыту на далейшае ўдасканаленне гаспадаркі неабходна выдзяляць уласнікам па 15–25 га зямлі, а ў сувязі з абмежаваным запасам зямлі на сям'ю звычайна адводзілася па 4–8 га (паводле іншых звестак 7–10 га). Больш за гэта незаможны гаспадар не змог бы асвоіць з-за адсутнасці неабходнага інвентару і свойскай жывёлы (коней, валоў). Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі за 1932 г. на 100 га ворных зямель у вяскоўцаў Заходняй Беларусі ў параўнанні з астатнімі рэгіёнамі краіны прыходзілася найменшая колькасць галоў свойскай жывёлы, што стварала істотныя перашкоды [6, с. 52]. Акрамя таго, у разглядаемы перыяд з 1 га ворнай зямлі ў параўнанні з вяскоўцамі іншых ваяводстваў заходнебеларускія сяляне выраблялі менш прадукцыі і адпаведна атрымлівалі значна меншы прыбытак [11, с. 28].

Сучаснікі апісваемых падзей папярэджвалі сялян, што ўсялякія змены і ўдасканаленні ў гаспадарцы належыць ажыццяўляць паступова і ў залежнасці ад яе фінансавага патэнцыялу. Пры гаспадаранні нельга кіравацца прынцыпам "сілу мераць у баі" з-за пагрозы хутка атрымаць вялікія страты, а з імі даўгі і нават банкруцтва, падкрэслівалася неабходнасць вядзення падлікаў рэнтабельнасці: "аловак у гаспадарцы з'яўляецца адной з найважнейшых сельскагаспадарчых прылад". Сціслы рахунак прывучаў гаспадара разумець, дзе ён працуе добра, а дзе дрэнна і чаму [12, s. 66–67]. У якасці прыкладу можна прывесці словы сялянкі Пастаўскага павета Віленскага ваяводства (1933 г.) : "у нас не было ніводнай крыніцы для атрымання сродкаў на ажыццяўленне хоць бы самых дробязных, але неабходных паляпшэнняў у гаспадарцы і на выпіску хоць бы самага таннага сельскагаспадарчага часопіса, якія даваў бы першасныя парады… Зробленая намі пазыка рашуча загарадзіла шлях усялякім спробам паляпшэння нашага дабрабыту. На адны толькі працэнты ідзе ўся жывёла (сродкі ад яе продажу), а пазыка застаецца пазыкай" [13, с. 248–249]. Падобныя сітуацыі нярэдкасць і ў наш час, але ў цэлым відавочна, што з дапамогай крэдытавання многія сяляне змаглі рэарганізаваць гаспадарку.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Асаблівая ўвага ў развіцці прадпрымальніцтва польскімі ўладамі надавалася моладзі, напрыканцы 1920-х гг. была распрацавана спецыяльная агульнадзяржаўная праграма “Сельскагаспадарчая падрыхтоўка”, якая прадугледжвала стварэнне ў кожным павеце сельскагаспадарчых школ для 15 юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 15–20 гадоў курсам навучання ў 3 гады: земляробства, жывёлагадоўля і агульная гаспадарка. Пры гэтым падкрэслівалася, што першаснай задачай праграмы з’яўляецца “накірунак маладых розумаў на шлях мэтанакіраванага земляробчага мыслення, самастойнасці і крытычных адносін да прадпрымаемых гаспадарчых распачынанняў, да мэтанакіраванай сельскагаспадарчай самаадукацыі і ўмелага выкарыстання атрыманых ведаў у жыцці” [14, с. 20].

Стымуляванне прадпрымальніцкай ініцыятывы польскія ўлады ажыццяўлялі таксама пры дапамозе рознага роду сельскагаспадарчых конкурсаў і выстаў. У кожным заходнебеларускім павеце на той час існавалі сельскагаспадарчыя гурткі, якія актыўна супрацоўнічалі з органамі ўлады і арганізоўвалі паказальныя палі, пункты па ачыстцы насення, садзейнічалі стварэнню пунктаў арэнды сельскагаспадарчых машын і інвентара, гандлёва-збытавых арганізацый, займаліся асветніцкай дзейнасцю ў галіне агранамii і агратэхнікі, агітацыяй сялянства (асабліва моладзі) за выкарыстанне перадавых метадаў гаспадарання і г. д. З гэтай мэтай улады праводзілі з актыўным удзелам сялян і шматлікіх грамадскіх аб’яднанняў разнастайныя сельскагаспадарчыя выставы-продажы і конкурсы. Так, напрыклад, 30 верасня 1928 г. у вёсцы Парэчча Пінскага павета Палескага ваяводства прайшла дэманстрацыя (выстава) дасягненняў мясцовай жывёлагадоўлі, на якую з гміны Парэчча было дастаўлена 76 галоў буйной рагатай жывёлы і 47 коней. Судзейская камісія выдала пераможцам 6 пахвальных грамат, 4 плугі і 11 грашовых узнагарод. Выстава выклікала ў сялян сутнасную цікавасць да далейшага рацыянальнага вядзення гаспадаркі і павышэння агратэхнічнай культуры [15, с. 173–174].

Разам з тым, недахоп агульных ведаў і спецыяльнай падрыхтоўкі не заўсёды дазваляў карэнную прагрэсіўную перабудову асабістай гаспадаркі, і таму селянін звычайна захоўваў традыцыйныя метады гаспадарання – перш за ўсё трохполле. Узоравымі станавіліся тыя

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сялянскія гаспадаркі, у якіх пад кіраўніцтвам спецыяльна падрыхтаванага агранамічнага персаналу былі распрацаваны і ўкаранены тагачасныя перадавыя метады гаспадарання, найперш за ўсё чаргаванне сельскагаспадарчых культур і арганізацыя штучнай пашы [16, s. 451]. У якасці найбольш выразных арыентыраў для сялян у рэарганізацыі гаспадаркі на таварна-рынкавых асновах і вядзення такім чынам прынцыпова новай прадпрымальніцкай дзейнасці можна назваць рээмігрантаў з капіталістычных краін. Па ацэнках даследчыкаў на той час у Заходняй Беларусі фактычна не было буйной вёскі, дзе не пражываў бы вяртальнік у першую чаргу са Злучаных Штатаў Амерыкі, які бы не паставіў вялікай і чыстай хаты, адпавядаючай усім гігіенічным патрабаванням. Аднак, як паказала жыццё, рээмігранты на жаль не змаглі ў поўнай меры выканаць сваю гістарычную місію, у большасці ж выпадкаў на набытай за зароблены ў эміграцыі грошы зямлі сяляне вялі гаспадарку па-старому, было таксама зафіксавана, што ў вёсцы Чудзін Лунінецкага павета Палескага ваяводства мясцовы жыхар пасля вяртання з ЗША і набыцця тут млына пачаў браць з сялян аплату натурай, што ў эканамічным плане ацэньваецца як істотны крок назад [4, s. 75, 113–114].

Дзякуючы аграрнай рэформе, выдачы сялянам танных крэдытаў і ў выніку паляпшэння культуры апрацоўкі зямлі, сельская гаспадарка міжваеннай Польшчы і Заходняй Беларусі ў прыватнасці змагла дасягнуць даволі высокай ступені развіцця, а паказчыкі ураджайнасці галоўных сельскагаспадарчых культур у 1930-я гг. значна выраслі і дасягнулі ўзроўню тагачасных перадавых краін свету: Францыі і ЗША [17, с. 421]. На жаль павышэнне дабрабыту заходнебеларускага сялянства не выклікала адначасовае паляпшэнне ўмоў жыцця. Як успамінаў жыхар вёскі Гарадная Столінскага павета Палескага ваяводства Ф.І. Вячорка, сучаснік і ўдзельнік разглядаемых падзей, становішча заходнебеларускай вёскі напрыканцы існавання міжваеннай Польшчы было досыць супярэчлівым: “За кароткі час да непазнавальнасці змяніўся выгляд сялянскай эканомікі. Дабавілася ў людзей хлеба, сена, жывёлы. У кожнага селяніна з’явіўся асабісты лес… З’явіліся сечкарні, малацілкі, а дзе-нідзе нават ровары… Дабрабыту ў людзей заўважна дабавілася, але працы не паменшала, а хутчэй наадварот. Стала больш жывёлы, значыць, трэба больш нарыхтоўваць ці купляць

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сена, патрабавалася больш пастухоў. Дабавілася ворыўнай зямлі: значыць, трэба было яе апрацаваць, сабраць і перапрацаваць ураджай. Таму людзі, як тады казалі, “света Божага з-за працы не бачылі” [18, с. 249].

Падводзячы вынікі, можна вызначыць наступныя паказчыкі прадпрымальніцкіх гаспадарак:

1. Наяўнасць зямлі не менш 10-15 га, бо на меншым надзеле зямлі цяжка арганізаваць цэльную вытворную гаспадарку;
2. Шырокае выкарыстанне наёмнай рабочай сілы, бо такі вялікі зямельны абшар уласнік са сваімі сямейнікамі не мог апрацаваць самастойна;
3. Імкненне весці сваю гаспадарку сучаснымі метадамі гаспадарання, што праяўлялася найперш за ўсё ў:

a) спецыялізацыі гаспадаркі;

b) агульнай зацікаўленасці ў пашырэнні ўласнага кругагляду і павышэнню ўзроўню агратэхнічнай культуры;

c) выкарыстанні сельскагаспадарчых машын і штучных угнаенняў;

d) вядзенні агульнага рахункаводства і звароту ў банк за крэдытам з мэтай фінансавай падтрымкі далейшай інтэнсіфікацыі гаспадаркі.

Польскія ўлады ў 1921–1939 гг. усяляк заахвочвалі заходнебеларускіх сялян да рэарганізацыі сваіх гаспадарак па капіталістычнай мадэлі, імкнуліся да раззняволення іх гаспадарчай ініцыятывы, усталявання цеснай сувязі з рынкам і такім чынам складвання ў міжваеннай Польшчы агульнага народна-гаспадарчага комплекса, мяркуючы такім чынам забяспечыць прадуктовую бяспеку краіны і ў цэлым спакой на вёсцы, але ўрадавая дапамога сялянам была даволі абмежаванай, што было ў многім абумоўлена складанымі эканамічныі абставінамі, і таму падтрымка аказвалася перш за ўсё найбольш лаяльным да іх вяскоўцам. Самая пільная ўвага ў гэты час польскімі ўладамі надавалася моладзі як найбольш адукаванай і эканамічна актыўнай частцы сялянства, якая імкнулася да гаспадарчай самастойнасці і таму з гатоўнасцю і разуменнем укараняла на сваіх надзелах найбольш перадавыя метады і прынцыпы арганізацыі гаспадаркі. У цэлым за вызначаны перыяд у аграрнай сферы Заходняй Беларусі адбывалася пашырэнне таварна-капіталістычных рынкавых адносін і ўзбагачэнне той часткі сялян,

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

якая змагла ў такіх надзвычай складаных сацыяльна-эканамічных абставінах рэарганізаваць сваю гаспадарку згодна новым патрабаванням у прадпрымальніцкім духу.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Rolnictwo w Polsce: jaki jest stan rolnictwa i co rząd robi dla jego podniesienia. – Warszawa : Wydaw. Bezpartyjnego Bloku Współpr. z Rządem, 1930. – 32 s.
2. Tomczonek, Z. Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Tomczonek. – Białystok : Wydaw. Politech. Białostockiej, 1996. – 247 s.
3. Мисиюк, В. С. Экономические условия модернизации крестьянского хозяйства Западной Белоруссии (1921–39 гг.) / В. С. Мисиюк // Славянские страны в условиях системной трансформации и европейской интеграции : сб. науч. тр. каф. соц.-гуманитар. наук / Брест. гос. техн. ун-т. – Брест, 2005. – Вып. 2. – С. 95–99.
4. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia, 1921–1939: zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : Państ. Wydaw. Nauk., 1963. – 208 s.
5. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.
6. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса, 1929–1933 гг. / И. В. Полуян ; ред. М. П. Костюк. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 205 с.
7. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Выш. шк., 1975. – 110 с.
8. Reformy rolne w Polsce międzywojennej i powojennej: prawo, realizacja, skutki, problemy reprywatyzacyjne / red. nauk.: E. Borkowska-Bagieńska, W. Szafrański. – Poznań : Wydaw. Nauk. Uniw. im. A. Mickiewicza, 2008. – 246 s.
9. Dziedzictwo: ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu / pod red. T. Chrzanowskiego. – Kraków : Znak, 1996. – 301 s.
10. Roszkowski, W. Land reforms in East Central Europe after World War One / W. Roszkowski. – Warsaw : Inst. of Polit. Studies Pol. Acad. of Sciences, 1995. – 256 p.
11. Зялінскі, П. І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919–1939 гг.) / П. І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: П. І. Брыгадзін [і інш.]. – Мінск, 2000. – С. 24–30.
12. Żmigrodzki, K. Scalanie gruntów na podstawie ustawy z dnia 31 lipca 1923 oraz uzupełniających ją rozporządzeń i przepisów / K. Żmigrodzki. – Tarnopol : [s. n.], 1935. – 73 s.
13. Польские крестьяне о своей жизни : письма крестьян, изд. Ин-том соц. экономики в Варшаве / под ред. и с предисл. Я. Михальчука ; пер. с пол. под ред. С. Бергмана. – М. : Междунар. аграр. ин-т, 1936. – 253 с.
14. Кривуть, В. И. Конкурсная система сельскохозяйственной подготовки молодежи Западной Беларуси в межвоенный период / В. И. Кривуть // Весці БДПУ. Серыя 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2016. – № 4. – С. 19–23.
15. Памяць: Пінскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелТА, 2003. – 621 с.
16. Odlanicki-Poczobutt, St. Województwo Nowogródzkie / St. Odlanicki-Poczobutt. – Wilno : Nakl. Wileńskiej Izby Rol., 1936. – 498 s.
17. Хаўратовіч, І. Заходняя Беларусь / І. Хаўратовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 421–425.
18. Чарнякевіч, І. С. Асоба ў працэсах змен на Заходнім Палессі ў XX стагоддзі: ўспаміны Ф. І. Вячоркі / І. С. Чарнякевіч // Личность в истории: героическое и трагическое : сб. материалов Пятой междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию ист. фак., Брест, 23–24 нояб. 2011 г. / Брест. гос. ун-т ; редкол.: М. Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест, 2012. – С. 249–256.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

References:

1. *Rolnictwo w Polsce: jaki jest stan rolnictwa i co rząd robi dla jego podniesienia*. Warszawa, Wydawnictwo Bezpartyjnego Bloku *Współpracy* z Rządem, 1930. 32 p. (in Polish).
2. Tomczonek Z. *Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej*. Białystok, Wydawnictwa Politechniki Białostockiej, 1996. 247 p. (in Polish).
3. Misiyuk V. S. Economic conditions for the modernization of peasant farming in Western Belarus (1921–39). *Slavyanskie strany v usloviyakh sistemnoi transformatsii i evropeiskoi integratsii: sbornik nauchnykh trudov kafedr sotsial'no-gumanitarnykh nauk* [Slavic countries in the context of systemic transformation and European integration: a collection of scientific papers from the departments of social and humanitarian sciences]. Brest, 2005, iss. 2, pp. 95–99 (in Russian).
4. Tomaszewski J. *Z dziejów Polesia, 1921–1939: zarys stosunków społeczno-ekonomicznych*. Warszawa, Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1963. 208 p. (in Polish).
5. Sorokin A. A. *The agrarian question in Western Belarus (1920–1939)*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1968. 201 p. (in Russian).
6. Poluyan I. V. *Western Byelorussia during the economic crisis, 1929–1933*. Minsk, Nauka i tekhnika Publ., 1991. 205 p. (in Russian).
7. Kukharev B. E. *Agriculture of Western Byelorussia (1919–1939 gg.)*. Minsk, Vysheishaya shkola Publ., 1975. 110 p. (in Russian).
8. Borkowska-Bagieńska E., Szafrański W. (eds.). *Reformy rolne w Polsce międzywojennej i powojennej: prawo, realizacja, skutki, problemy reprywatyzacyjne*. Poznań, Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu im. A. Mickiewicza, 2008. 246 p. (in Polish).
9. Chrzanowski T. (ed.). *Dziedzictwo: ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu*. Kraków, Znak, 1996. 301 p. (in Polish).
10. Roszkowski W. *Land reforms in East Central Europe after World War One*. Warsaw, Institute of Political Studies, Polish Academy of Sciences, 1995. 256 p.
11. Zyalinski P. I. Agrarian reform in Western Belarus (1919–1939 гг.). *Prablemy uz'yadnannya Zakhodnyai Belarusi z BSSR: gistoryya i suchasnasts': materyyaly Mizhnarodnai navukova-tearetychnai kanferentsyi, Minsk, 17–18 verasnya 1999 g.* [Problems of the reunification of Western Belarus with the BSSR: history and present: proceedings of the International scientific and theoretical conference, Minsk, 17–18 September, 1999]. Мінск, 2000, pp. 24–30 (in Belarusian).
12. Żmigrodzki K. *Scalanie gruntów na podstawie ustawy z dnia 31 lipca 1923 oraz uzupełniających ją rozporządzeń i przepisów*. Tarnopol, 1935. 73 p. (in Polish).
13. *Polish peasants about their lives: letters from peasants, published by the Institute of Social Economy in Warsaw*. Moscow, International Agrarian Institute, 1936. 253 p. (in Russian).
14. Krivut' V. I. Competitive system of agricultural training for young people in Western Belarus during the interwar period. *Vestsi BDPU. Seryya 2, Gistoryya. Filasofiya. Palitalogiya. Satsyyalogiya. Ekanomika. Kul'turalogiya = BSPU Bulletin. Series 2, History. Philosophy. Political Science. Sociology. Economics. Culture Studies*, 2016, no. 4, pp. 19–23 (in Russian).
15. Kisyaleu G. K. (ed.) [et al.]. *Remembrance: Pinsk district: historical and documentary chronicles of cities and districts of Belarus*. Minsk, BelTA Publ., 2003. 621 p. (in Belarusian).
16. Odlanicki-Poczobutt St. *Województwo Nowogródzkie*. Wilno, Nakładem Wileńskiej Izby Rolniczej, 1936. 498 p. (in Polish).
17. Khauratovich I. Western Belarus. *Encyclopedia of the history of Belarus: in 6 volumes. Vol. 3*. Minsk, 1996, pp. 421–425 (in Belarusian).
18. Charnyakevich I. S. Personality in the process of change in Western Polesia in the 20th century: memories of F. I. Vyachorka. *Lichnost' v istorii: geroicheskoe i tragicheskoe: sbornik materialov Pyatoi mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii, posvyashchennoi 20-letiyu istoricheskogo fakul'teta, Brest, 23–24 noyabrya 2011 g.* [Personality in history: heroic and tragic: collection of materials of the Fifth international scientific and practical conference dedicated to the 20th anniversary of the Faculty of History, Brest, November 23–24, 2011]. Brest, 2012, pp. 249–256 (in Belarusian).

Дата паступлення артыкула 11.08.2025
Received 11.08.2025

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

УДК 332.21:94(476–15) «1921/1939»
https://doi.org/10.5281/zenodo.17097963

В. П. Гарматны

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

ДА ПЫТАННЯ ПРАВЯДЗЕННЯ КАМАСАЦЫІ Ў ГМІНЕ ЦЫРЫН НАВАГРУДСКАГА ПАВЕТА І ВАЯВОДСТВА Ў 1921–1939 ГГ.

Анатацыя. У 1921–1939 гг. Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад міжваеннай Польшчы. Аснову эканомікі рэгіёна на той час складала сельская гаспадарка, якая моцна пакутавала ад рознага роду перажыткаў, адным з галоўных з якіх была цераспалосіца. З мэтай яе ліквідацыі ажыццяўлялася палітыка камасацыі, якая пры ўсёй сваёй прагрэсіўнасці была для сялян занадта каштоўнай і працяглай па часе. У артыкуле разглядаецца правядзенне камасацыі на абшары гміны Цырын Навагрудскага павета Навагрудскага ваяводства (сучасны Карэліцкі раён).

Ключавыя словы: сельская гаспадарка, цераспалосіца, камасацыя, хутар, крэдыт, ураджайнасць.

Для цытавання. Гарматны, В. П. Да пытання правядзення камасацыі ў гміне Цырын Навагрудскага павета і ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. П. Гарматны // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. III Междунар. науч. конф., приуроч. к 80-летию Победы в Великой Отечеств. войне, Минск, 26 сент. 2025 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2025. – С. 58–66.

В. П. Гарматный

Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь

К ВОПРОСУ О ПРОВЕДЕНИИ КОМАСАЦИИ В ГМИНЕ ЦИРИН НОВОГРУДКОВСКОГО ПОВЕТА И ВОЕВОДСТВА В 1921–1939 ГГ.

Аннотация. В 1921–1939 гг. Западная Беларусь входила в состав межвоенной Польши. Основу экономики региона в то время составляло сельское хозяйство, сильно страдавшее от различных пережитков, одним из главных из которых была чересполосица. С целью её ликвидации проводилась политика комасации земель, которая, несмотря на всю свою прогрессивность, оказалась для крестьян слишком дорогой и затянутой. В статье рассматривается проведение комасации земель на территории гмины Цирин Новогрудского повета Новогрудского воеводства (современный Кореличский район).

Ключевые слова: сельское хозяйство, чересполосица, комасация земель, хутор, кредит, урожайность.

Vitaliy P. Harmatny

The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ON THE ISSUE OF CONDUCTING LAND COMASATION IN THE GMINA OF CYRYN OF THE NOVOGRUDOK POWIAT AND VOIVODESHIP IN 1921–1939

Abstract. In 1921–1939, Western Belarus was part of interwar Poland. The economy of the region at that time was based on agriculture, which suffered greatly from various vestiges, one of the

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

most important of which was the strip holding of land. In order to eliminate it, a policy of land comasation was implemented, which, despite all its progressiveness, turned out to be too expensive and protracted for the peasants.The article examines the implementation of land comasation on the territory of the Cyryn gmina of Novogrudok powiat, Novogrudok voivodeship (present-day Korelichi District).

Keywords: agriculture, strip holding, land comasation, khutor, credit, crop yield.

For citation. Harmatny V. P. On the issue of conducting land comasation in the gmina of Cyryn of the Novogrudok powiat and voivodeship in 1921–1939. Agriculture of Belarus through the prism of scientific research : proceedings of the III International scientific conference dedicated to the 80th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War, Minsk, September 26, 2025. Minsk, 2025, pp. 58–66 (in Belarusian).

На працягу міжваеннага перыяду Заходняя Беларусь з'яўлялася складовай часткай народна-гаспадарчага комплексу польскай дзяржавы і ў асноўным выконвала функцыі аграрна-сыравіннага прыдатка. Заходнебеларускія землі былі падзелены на ваяводствы (адным з якіх стала Навагрудскае), а яны ў сваю чаргу на паветы і гміны. У гэты час Цырын стаў мястэчкам і цэнтрам аднаіменнай гміны Навагрудскага павета і ваяводства, якая аб'ядноўвала 82 населеныя пункты, агульнай колькасцю 6 183 чалавекі, што для параўнання было толькі нязначна менш, чым у ваяводскім цэнтру Навагрудку, дзе пражывала на той час 6 367 чалавек. Пры гэтым паводле ўсепольскага перапісу ад 30 кастрычніка 1921 г. у Цырыне налічвалася 274 жыхара (138 мужчын і 136 жанчын) і па дадзенаму паказчыку ён адставаў ад навакольных вёсак Кайшоўка (327), Равіны (324), Рамейкі (288) і Аканавічы (282), у сваю чаргу яму нязначна саступала Літароўшчына (268) [1, s. 61–62]. На 1935 г. у гміне Цырын налічвалася 18 грамад, якія аб'ядноўвалі больш 90 рознага роду паселішч [2, s. 46–48].

Галоўную частку мясцовага насельніцтва складалі сяляне, якія востра пакутавалі ад наступстваў Першай Сусветнай і Польска-савецкай войн і малазямелля ў цэлым. Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г. частка насельцтва гміны Цырын вярнулася з эвакуацыі і пачала ўзнаўляць разбураныя гаспадаркі, па стане на 1921 г. тут з 1 096 сем'яў 360 не мелі жылля і жылі ў прыстасаваных памяшканнях [3, с. 111]. У нашым распараджэнні на жаль маюцца статыстычныя звесткі толькі па Навагрудскаму павету ў цэлым, але на думку аўтара іх хутчэй за ўсё можна суаднесці з агульнай сітуацыяй у гміне Цырын. На 1930–1931 гаспадарчы год плошча Навагрудскага павету ахоплівала 263 433 га, з іх сельскагаспадарчыя землі складалі 121 941 га (46,3 %), лугі

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

35 117 (13,3 %), паша 13 253 (5,0 %), сады і агароды – 6 609 (2,5 %), лясы – 54 420 (20,7 %), няўжыткі – 32 093 (12,2 %) адпаведна [4, s. 20]. Паводле апытання ў 1933 г. 21 уладальніка самастойных гаспадарак Навагрудскага павета ў якасці мінімальнага зямельнага надзелу, з якога тут магла пракарміцца сям'я, вызначаліся 7,3 га [5, s. 151], на той час як па розных ацэнках больш паловы мясцовых гаспадарак такім абшарам не валодалі і ў выніку вымушаны былі шукаць дадатковыя сродкі існавання, перш за ўсё наймацца да працу да памешчыкаў і сваіх больш заможных суседзяў.

Сітуацыю ў мясцовай аграрнай сферы надзвычай ускладняла захаванне рознага роду пережыткаў з часоў паншчыны, адным з асноўных з якіх стала цераспалосіца – наяўнасць у сялян па некалькіх невялікіх вузкіх раскіданых зямельных надзелаў (у так званым шахматным парадку), што істотна павялічвала колькасць працадзён, неабходных для іх апрацоўкі [3, с. 111]. Некаторыя сялянскія гаспадаркі распадаліся, напрыклад, нават на некалькі дзясяткаў невялікіх раскіданых зямельных надзелаў. У многіх выпадках надзелы былі надзвычай вузкімі, што селяніну з канём цяжка было на іх нават развярнуцца. У многіх выпадках межы займалі да 10 % плошчы надзелаў, не лічачы страт з-за складанай сістэмы даезду, выкліканай існуючай канфігурацыяй надзелаў. Па меркаванні тагачасных даследчыкаў межы адначасова з'яўляліся рассаднікамі пустазелля і аблюбаваным месцам пражывання пацукоў і іншых шкоднікаў.

Цераспалосіца ў выніку прыводзіла да дарэмнага празмернага выкарыстання сялянскай працы, марнай траты часу і сродкаў, істотна замаруджвала і ўскладняла развіццё мясцовай аграрнай сферы, асуджала сялянства на нізкі жыццёвы ўзровень [6, с. 35]. У такой сітуацыі заходнебеларуская сельская гаспадарка не мела аніякіх далейшых перспектыў без правядзення адпаведнай рэформы, а ліквідацыя цераспалосіцы станавілася яе фундаментам, бо без яе ажыццяўлення іншыя мерапрыемствы рэформы не маглі стаць паспяховымі. Наяўнасць такой істотнай колькасці надзелаў суправаджалася праблемамі ў справе вызначэння іх уласнасці, што прыводзіла да істотных канфліктаў і нават боек паміж аднавяскоўцамі.

У сувязі з гэтым адной з галоўных складовых частак польскай аграрнай рэформы ў 1921–1939 гг. стала камасацыя (хутарызацыя) –

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

аб’яднанне раскіданых невялікіх сялянскіх зямельных надзелаў і перанясенне сюды хаты і сельскагаспадарчых пабудоў і стварэннем такім чынам хутара. Закон аб ажыццяўленні камасацыі прыняты польскім Сеймам 31 ліпеня 1923 г. [7].

Для распачатку прац па камасацыі вёскі неабходна была папярэдняя заява яе жыхароў і пры гэтым варта падкрэсліць, што многія мясцовыя сяляне бачылі ў камасацыі сродак паляпшэння свайго становішча. Напрыклад, 27 мая 1934 г. сяляне вёскі Рамейкі звярталіся ў мясцовую павятовую зямельную ўправу з заявай “аб як мага хутчэйшым правядзенні ссялення і камасацыі нашых зямель. Просьбу сваю абгрунтоўваем тым, што ў выніку ліквідацыі нашага сервітута ў маёнтку Варонча і выдзяленні таго ж у мясцовасці “Плюжыны” (гай “Цёмны Бор”) у адлегласці 6–7-мі кіламетраў, нашае становішча ў поглядах гаспадарчых і матэрыяльных абвострылася да немагчымасці. Да таго ж засталіся мы пазбаўлены магчымасці схову (свайго) інвентара з-за такой адлегласці пашы, і таксама з-за таго, што нашыя гаспадаркі распадаюцца на 16 надзелаў, не можам такога вытрымаць… Выдзеленай нам пашай у “Цёмным Бары” не можам скарыстацца без правядзення камасацыі. Адзіным спосабам паляпшэння сітуацыі бачым камасацыю…” [8, Арк. 3]. Просьба сялян была канешне ўладамі задаволена.

Павятовая зямельная ўправа вызначала землямера, які павінен быў ажыццяўляць работы па камасацыі вёскі, пасля чаго з ім заключалася дамова, у якой прапісваліся стан землеўладання напярэдадні ссялення, кошты аплаты работ, этапы камасацыі і тэрміны іх рэалізацыі. Усе расходы па ўтрыманні землямера і яго дапаможнага апарата (перш за ўсё расквартараванне, забеспячэнне неабходнымі прыладамі і гужавым транспартам) разам з ажыццяўленнем адпаведных тэхнічных работ ускладаліся на жыхароў вёскі, дзе ішла камасацыя.

Заходнебеларускія сяляне маглі параўнаць працу розных землямераў і па водзывах і падказцы суседзяў стараліся выбраць сабе найбольш адказнага і сумленнага. Так, 7 кастрычніка 1935 г. сяляне мястэчка Цырын пісалі ў заяве ў Навагрудскую акруговую зямельную ўправу: “жадаючы аздаравіць нашыя гаспадаркі, …звяртаемся …**з гарачай просьбай паскорыць ссяленне зямель нашага мястэчка і выдаць загад аб выбары рады ссялення** (выдзелена ў дакуменце). Адначасова пераканаўча просім аб

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

правядзенні ссялення землямерам Юзафам Жытоўскім, таму што яго праца па ссяленні ў найбліжэйшых нашых суседзяў дае нам пэўную гарантыю саліднага і справядлівага падзелу нашай зямлі. Гэтага землямера, які пры ацэнцы надзелаў улічвае кожны квадратны метр, не можам не ўхваліць, бо кваліфікаваная і справядлівая ацэнка зямель ёсць першы і найважнейшы фактар справядлівай і беззаганнай працы па ссяленню". Аднак рашэннем уладаў праводзіць камасацыю мястэчка прызначаны Юзаф Вардашка [9, Арк. 46–48].

Пры ажыццяўленні камасацыі мясцовыя сяляне павінны былі абраць мясцовую раду (савет) ссялення, акрамя таго плаціць за камасацыю кожнага гектара ў залежнасці ад якасці зямлі звычайна ад 15 да 20 злотых, за складанне праектаў і правядзенне меліярацыі і перанясенне дарог, утрыманне землямера з дапаможным персаналам (галоўным чынам расквартараванне, забеспячэнне неабходнымі прыладамі і гужавым транспартам разам з ажыццяўленнем адпаведных тэхнічных работ) і г.д. [6, с. 36–37].

Пры правядзенні камасацыі сялянскія зямельныя надзелы спецыяльнай камісіяй ацэньваліся ў грашовым эквіваленце з улікам класіфікацыі ворных зямель па паказчыках ураджайнасці, але варта адзначыць, што многія заходнебеларускія сяляне былі незадаволены атрыманымі пры ссяленні зямельнымі надзеламі і накіроўвалі скаргі, але на думку прадстаўнікоў польскіх улад прашэнні сялян у абсалютнай большасці не адпавядалі рэчаіснасці і таму не заслугоўвалі ўвагі. Некаторыя сяляне былі ўпэўнены, што пры камасацыі будзе абавязкова праводзіцца дадатковае надзеленне ворнай зямлёй, але заканадаўства гэтага не прадугледжвала. Пры гэтым тагачасныя польскія дзяржаўцы неаднаразова папярэджвалі сялян, што камасацыя не прыводзіць аўтаматычна да паляпшэння асабістага матэрыяльнага стану, а з'яўляецца толькі пачаткам доўгага і складанага шляху па рэарганізацыі гаспадаркі з экстэнсіўнай (простай і накіраванай у першую чаргу на павелічэнне зямельнай плошчы пры захаванні састарэлых метадаў апрацоўкі зямлі) у якасна новую – інтэнсіўную, заснаваную на выкарыстанні перадавых метадаў арганізацыі гаспадарання, выкарыстанні рознага роду сельскагаспадарчых машын, высокаўрадлівых гатункаў сельскагаспадарчых культур і пародаў жывёлы, а таксама ў першую чаргу штучных мінеральных угнаенняў.

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Акрамя таго, пры рэалізацыі камасацыі некаторыя заходнебеларускія сяляне, жадаючы скарыстацца магчымасцю атрымаць дадатковую зямлю, падавалі ў зямельную ўправу звесткі аб падзеле сваёй гаспадаркі паміж дарослымі дзецьмі, нават калі гэта не адпавядала рэчаіснасці. Напрыклад, 31 студзеня 1937 г. жыхар мястэчка Цырын Аляксандр Нагацкі паведамляў, што падзяліў асабістую гаспадарку паміж сваімі дзецьмі, а пры камасацыі гаспадарка засталася запісанай толькі на яго. Пры праверцы абставін справы высветлілася, што сыны і дочкі Нагацкага яшчэ нежанатыя і незамужнія і для падзелу гаспадаркі няма законных падстаў [9, Арк. 239, 285–286].

Вялікае значэнне мелі царкоўныя землі (“папоўкі”), якія пры камасацыі, згодна дамовам урада з касцёлам, часта перадаваліся навакольнаму сялянству. Напрыклад, 27 красавіка 1935 г. сялянам вёскі Рамейкі ўлады вызначылі царкоўную зямлю абшарам 13,89 га [8, Арк. 85]. Заходнебеларускія сяляне спадзяваліся пры камасацыі павялічыць свае надзелы за кошт уладанняў мясцовых праваслаўных цэркваў (так званых “паповак”), але дабіцца сваёй мэты ім удавалася далёка не заўсёды, бо гэтыя землі пераважна перадаваліся асаднікам і сялянам-палякам ці рымска-каталіцкага веравызнання.

Галоўным фактарам пры вызначэнні месца атрымання новага надзелу зямлі з’яўлялася яе ўраджайнасць і апрацаванасць. Варта адзначыць, што для некаторых хутаран земляробства не было галоўнай крыніцай існавання, і тады на першае месца выходзілі зусім іншыя абставіны. Напрыклад, 4 кастрычніка 1937 г. капітан 78-га пяхотнага палка Аляксандр Матусевіч з Баранавіч, уладальнік зямлі ў ваколіцах Цырына, прасіў навагрудскага павятовага старасту выдзеліць яму пры правядзенні камасацыі надзел на царкоўных землях, за 500 метраў на поўнач ад мястэчка. Афіцэр абгрунтоўваў просьбу тым, што асабіста для яго галоўным фактарам з’яўляецца не ўраджайнасць зямлі, а яе месцазнаходжанне. У хуткім часе Матусевіч збіраўся звольніцца з армейскай службы і займацца грамадскаю дзейнасцю ў справе вайсковай падрыхтоўкі, а таму галоўным для яго з’яўляецца кантакт з грамадскасцю і наяўнасць побач пошты. Капітан прасіў выдзяліць яму надзел у азначаным месцы, бо ў іншым выпадку пацерпіць грамадская справа, нават калі будзе выдзелена лепшая зямля. Рашэннем павятовага старасты

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

